Я. Н. Марозава

М А Р Ф А Л О Г І Я

Частка 1

ІМЕННЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ

Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў

Репозиторий ВГУ

УДК 481 – (075.8)
ББК 81.411.3 – 21 – 923
М 28

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П. М. Машэрава” ***Я. Н. Марозава***

Рэцэнзент: дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П. М. Машэрава” кандыдат філалагічных навук ***С. М. Якаўлеў***

Адказны за выпуск: загадчык кафедры беларускага мовазнаўства дацэнт *Г.А.Арцямёнак*

Репозиторий ВГУ

Рэкамендуецца ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка па сучаснай беларускай мове для студэнтаў гуманітарных спецыяльнасцей ВНУ. Дапаможнік можа быць выкарыстаны як у працэсе самастойнай працы студэнтаў, так і для назірання і аналізу на практычных і лабараторных занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка.

У дапаможніку аналізуюцца тыповыя недахопы і памылкі студэнтаў пры граматычным разборы часцін мовы, даюцца неабходныя тлумачэнні, парады, падаюцца парадак і ўзоры марфалагічнага аналізу часцін мовы, прыводзяцца лінгваметадычныя каментарыі да ўзораў разбору, прапануецца прыкладная кантрольная работа па іменных часцінах мовы, у канцы змешчаны дадатак з табліцамі і каментарыямі да іх.

УДК 481 - (075. 8)
ББК 81. 411. 3 - 21 - 923

© Марозава Я.Н., 2005
© УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2005

У працэсе вывучэння марфалогіі ў студэнтаў, як і ў школьнікаў, настаўнікаў, узнікаюць шматлікія пытанні адносна марфалагічнага разбору слоў. Пэўныя цяжкасці марфалагічнага аналізу выкліканы найперш неаднастайнасцю, разнабоем, супярэчлівасцю рэкамендацый і ўзораў марфалагічнага разбору ў розных вучэбна-метадычных дапаможніках і падручніках для студэнтаў і школьнікаў.

Цяжкасці практычнага характару пры марфалагічным аналізе многіх слоў тлумачацца і недастатковым засваеннем сутнасці адпаведнага тэарэтычнага матэрыялу, сутнасці катэгорый і формаў розных часцін мовы.

У сувязі з гэтым у дапаможніку аналізуюцца тыповыя недахопы практычнага разбору часцін мовы студэнтамі, прыводзяцца парадак і ўзоры марфалагічнага аналізу іменных часцін мовы з лінгваметадычнымі каментарыямі да іх, прапануецца прыкладная кантрольная работа па іменных часцінах мовы для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў, у канцы дапаможніка змяшчаюцца змяшчаюцца табліцы і каментарыі да іх.

Дапаможнік не прэтэндуе на дасканаласць і бездакорнасць, аўтарка з удзячнасцю прыме і ўлічыць заўвагі і пажаданні для яго палепшання.

****
****
****

М А Р Ф А Л А Г І Ч Н Ы Р А З Б О Р самастойных часцін мовы прадугледжвае наступныя **Э Т А П Ы А Н А Л І З У**:

1) устанаўліваецца ч а с ц і н а м о в ы;
2) вызначаюцца л е к с і к а - г р а м а т ы ч н ы я р а з р а д ы;
3) выяўляюцца п а с т а я н н ы я (нязменныя) для гэтай часціны мовы г р а м а т ы ч н ы я к а т э г о р ы і;
4) характарызуюцца непастаянныя (зменныя) граматычныя катэгорыі, г. зн. ф о р м а с л о в а;
5) акрэсліваецца с і н т а к с і ч н а я ф у н к ц ы я слова.

ПЕРШЫ ЭТАП АНАЛІЗУ. Пры ўстанаўленні **ч а с ц і н ы м о в ы** аналізуемага слова недастаткова кіравацца толькі абагульненым граматычным значэннем слова. Пры вызначэнні часціны мовы трэба ўлічваць 1) семантычныя, 2) марфалагічныя і 3) сінтаксічныя прынцыпы (класіфікацыйныя прыметы) размежавання слоў па часцінах мовы, а таксама ўлічваць 4) асаблівасці словаўтварэння, характар парадыгмы, валентнасць слоў.

С е м а н т ы ч н ы прынцып размеркавання слоў азначае ўлік к а т э г а р ы я л ь н а г а з н а ч э н н я, г. зн. абагульненага граматычнага значэння слова. Напрыклад, усе назоўнікі маюць абагульненае значэнне

Репозиторий ВГУ

прадметнасці, усе прыметнікі — абагульненае значэнне **прыметы,** усе лічэбнікі — агульнае значэнне **ліку,** усе дзеясловы — значэнне **працэсу, дзеяння,** усе прыслоўі абазначаюць **прымету дзеяння** або **прымету прыметы** і г. д.

Марфалагічны прынцып прадугледжвае ўлік зменнасці / нязменнасці слова, спосабу змянення (скланяецца па ўзоры назоўніка ці прыметніка або спрагаецца, як дзеяслоў), улік асаблівасцей граматычных катэгорый слова: роду, ліку, склону, часу, асобы і г. д.

Сінтаксічны прынцып патрабуе ўлічваць тыповыя сінтаксічныя функцыі часціны мовы і спосабы яе сінтаксічнай сувязі.

Улік названых **прынцыпаў размежавання слоў па часцінах мовы** асабліва важны для выяўлення выпадкаў **пераходу слоў з адной часціны мовы ў другую,** што якраз і выклікае ў студэнтаў пэўныя цяжкасці. Напрыклад, пры пераходзе ў назоўнік словы мяняюць не толькі сінтаксічную функцыю, але і граматычныя катэгорыі: **род** былых прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, абагульнена-якасных займеннікаў становіцца **пастаяннай, нязменнай катэгорыяй**, паяўляецца **здольнасць дапасоўваць да сябе азначэнні**:

Паляўнічы сабака, паляўнічая стрэльба, паляўнічае таварыства, паляўнічыя нажы — тут прыметнік абазначае прымету, дапасуецца да назоўнікаў і змяняецца па родах, ліках і склонах у залежнасці ад змены назоўніка, у сказе з'яўляецца азначэннем. У наступным сказе "*Прыйшоў той самы паляўнічы*" слова *паляўнічы* ўжо назоўнік, бо абазначае асобу, па родах не змяняецца, а мае пастаянны род (мужчынскі), выконвае тыповую для назоўніка сінтаксічную функцыю дзейніка; як назоўнік, дапасоўвае да сябе азначэнне *той самы*. У прыведзеным прыкладзе слова *самы* таксама варта аналізаваць не як азначальны займеннік, бо яно страціла лексічнае значэнне і сінтаксічную ролю займенніка, а як узмацняльна-абмежавальную часціцу, ужытую са значэннем часціцы '*жа*'.

ДРУГІ ЭТАП АНАЛІЗУ. Пры вызначэнні **лексіка-граматычных разрадаў** таксама патрэбна мець на ўвазе, што словы часта могуць пераходзіць з аднаго разраду ў другі, асабліва пры пераносным ужыванні. Напрыклад, у наступным кантэксце слова *таленты* варта класіфікаваць, з аднаго боку, як назоўнік асабовы, канкрэтны (а не абстрактны), бо ўжыты ён у значэнні '*таленавітых людзей*'; а з другога боку, граматычна, фармальна ён тут паводзіць сябе як неадушаўлёны (у В. склоне канчатак такі, як у Н. склоне): *Шчодрая на таленты віцебская зямля. Тут нарадзілася шмат вядомых людзей — асветнікаў, пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, вучоных, палітычных дзеячаў, герояў ратнага і працоўнага подзвігу. (С. Пятровіч)*

Репозиторий ВГУ

(Шчодрая на) таленты (зямля) — назоўнік, у значэнні асабовага, канкрэтнага, па форме неадушаўлёны, а па значэнні адушаўлёны.

Займеннік *якую* ў наступным сказе не пытальны і не адносны, а няпэўны, бо тут ён з'яўляецца ўсечанай формай няпэўнага займенніка *якуюсьці* , дзе эліпсуецца, усякаецца постфікс *-сьці*:

Праз якую хвіліну і каня, і конніка паглынула цемра. (У.Караткевіч)

ТРЭЦІ ЭТАП АНАЛІЗУ. На трэцім этапе марфалагічнага аналізу вызначаюцца **пастаянныя граматычныя прыметы**: у назоўнікаў — род і скланенне, у асабовых займеннікаў нязменная асоба, а ва ўласна-асабовых *я, мы, ты, вы* пастаянным з'яўляецца і лік; у лічэбнікаў род з'яўляецца сталай прыметай толькі ў слоў *тысяча, мільён, мільярд, квадрыльён, квінтыльён, секстыльён*.

Але строга пільнавацца рэкамендаванага парадку разбору недастаткова. Неабходна яшчэ памятаць, што нярэдка зменныя для якой-небудзь часціны мовы граматычныя прыметы ў асобных групах слоў з'яўляюцца пастаяннымі. Так, напрыклад, **лік** у назоўнікаў — зменная граматычная катэгорыя, але ў адзіночналікавых назоўнікаў тыпу *Віцебск, насенне, шчасце* і ў множналікавых тыпу *Жыткавічы, дрожджы, сані* лік — пастаянная прымета, бо яны не змяняюцца па ліках. Таму пры разборы такіх назоўнікаў недарэчным будзе запіс: "*ужыты ў форме адз. л. (мн. л.)*", для іх лагічным будзе ўказаць перад характарыстыкай формы: ***адзіночналікавы*** **(**або ***множналікавы*****).**

Уласны назоўнік "*Салавей*" у наступным кантэксце таксама ***адзіночналікавы*** (хаця агульны назоўнік *салавей* змяняецца па ліках): *Чытаў "Салаўя" З. Бядулі.*

Такіх прыкладаў шмат.

І наадварот. **Род** у назоўнікаў — сталая прымета, але многія субстантываты захоўваюць (цалкам ці часткова) зменнасць роду, г. зн. ранейшую граматычную ўласцівасць тых часцін мовы, з якіх яны перайшлі ў назоўнік (прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, парадкавых лічэбнікаў, абагульнена-якасных займеннікаў): *Мой (мая, маё) сёння дома не начаваў. Малы (малая, малое) паціху гадуецца. Класны (класная) з намі ідзе ў паход.* Для такіх назоўнікаў будзе правільным запіс ***"ужыты ў форме м. р. (ж. р., н. р.)".***

ЧАЦВЁРТЫ ЭТАП АНАЛІЗУ. Пры характарыстыцы зменных граматычных прымет — **формы слова** — трэба мець на ўвазе, што **ў нязменных слоў усе формы аманімічныя**, інакш кажучы, парадыгма складаецца з адной формы. Таму для нязменных слоў запісы "*пачатковая форма…*" і "*ўжыты ў форме … ліку, … склону*" з'яўляюцца алагічнымі. У такіх слоў неабходна ўказваць **не форму** ліку, склону, **а лікавае і склонавае значэнне,** якое выяўляецца

Репозиторий БГУ

сінтаксічна: па пытаннях (у тым ліку разам з прыназоўнікамі), па залежных словах, шляхам падстаноўкі зменных слоў. Напрыклад:

(Стаялі ў тым) фае — назоўнік, **нязменны**; … ніякага роду, нулявога скланення; **мае значэнне** адз. ліку, М. склону.

ПЯТЫ ЭТАП АНАЛІЗУ. Пры характарыстыцы **сінтаксічнай функцыі** слоў не толькі студэнтамі, школьнікамі, але і аўтарамі некаторых вучэбна-метадычных дапаможнікаў не ўлічваецца той факт, што функцыю якога-небудзь члена сказа, зваротка, пабочнай ці ўстаўной канструкцыі можа выконваць не толькі а) **адно** аналізуемае слова, але і б) **некалькі слоў самастойных** часцін мовы ці в) **словаформа,** якая можа выражацца склонавай формай назоўніка (займенніка) **разам з прыназоўнікам** або **разам з часціцай.** У двух апошніх выпадках б) і в) будуць няправільнымі запісы: ”*выконвае сінтаксічную функцыю (ролю)…*” або ”*ў сказе з’яўляецца…*”. Трэба дакладна акрэсліваць **сінтаксічную ролю слова** ў сказе. Таму лічым лагічнымі наступныя

ТРЫ ВАРЫЯНТЫ ЗАПІСАЎ:

① Калі аналізуемае слова **САМО, АДНО** выконвае сінтаксічную ролю, то дакладным будзе любы з двух наступных запісаў: ***”у сказе з’яўляецца …” ; ”выконвае сінтаксічную функцыю (ролю) …”.***

② Калі сінтаксічную функцыю выконваюць **ДВА І БОЛЬШ ПАЎНАЗНАЧНЫХ СЛОЎ** , то прымальны такі варыянт запісу: ***”у сказе ўваходзіць у склад …” .***

③ Калі аналізуемае слова **НЕ АДНО, А РАЗАМ СА СЛУЖБОВЫМ СЛОВАМ** выконвае сінтаксічную ролю, то патрэбна ўказаць гэта: ***”разам з прыназоўнікам (часціцай) … выконвае сінт. функцыю (ролю) …”.*** Напрыклад:

Малады настаўнік вельмі многа гаворыць. У яго рабоце шмат непатрэбнай мітусні. Прыкра, калі нехта пачынае хваліць такога выкладчыка. Маўляў, стараецца. (Я. Ермаловіч)

1. *(…гаворыць) вельмі (многа)* — у сказе **з’яўляецца** акалічнасцю меры і ступені.

2. *(…нехта пачынае) хваліць* — **уваходзіць у склад** састаўнога дзеяслоўнага выказніка пачынае хваліць.

3. *(У) рабоце (шмат мітусні)* — **разам з прыназоўнікам у выконвае** сінтаксічную ролю ўскоснага дапаўнення (з адценнем акалічнасці месца).

Репозиторий БГУ

УВАГА ! Пры марфалагічным разборы мэтазгодна ўказваць ***ВІД ДАДАНАГА ЧЛЕНА СКАЗА !*** (Гл. прыклады вышэй) Калі словы маюць, акрамя асноўнага, яшчэ і дадатковае адценне якога-небудзь члена сказа, то пажадана ўказаць яго, як у вышэй прыведзеным прыкладзе *у рабоце*. Гэтаксама: *(Помнік) салдатам* — выконвае сінтаксічную ролю недапасаванага азначэння (з адценнем ускоснага дапаўнення).

САМЫЯ ТЫПОВЫЯ ПАМЫЛКІ студэнтаў пры марфалагічным разборы — гэта **няправільнае вызначэнне формы** аналізуемых слоў (асабліва **формы склону**) і іх **сінтаксічнай функцыі**, а нярэдка і **няправільнае вызначэнне часціны мовы**. **Асноўнай прычынай** гэтых памылак, як паказвае практыка, з'яўляецца няўважлівасць і неахайнасць у афармленні запісаў, калі для аналізу бярэцца (вылучаецца са сказа) "голае" слова, без уліку кантэксту. Каб пазбегнуць гэтых недарэчнасцей і правільна вызначыць часціну мовы, яе форму і сінтаксічную функцыю ў сказе, слова для аналізу мэтазгодна выпісваць з кароткім кантэкстам — са словамі, ад якіх да яго ставіцца пытанне, а таксама разам з якімі яно выконвае адну сінтаксічную функцыю.

Напрыклад, гледзячы не на кантэкст, а на асобна ўзятае слова, **прыналежныя** займеннікі ***яго, яе, іх*** студэнты памылкова разбіраюць **як асабовыя,** застылыя формы слоў кваліфікуюць **як зменныя,** не карыстаюцца прыёмам падстаноўкі (замены) на зменныя прыналежныя займеннікі і таму няправільна вызначаюць разрады і форму слова. Параўнаем прыклады разбору слоў з наступнага кантэксту:

*Максім Багдановіч… Кароткім быў **яго** жыццёвы век. Ён вымяраецца дваццаццю пяццю гадамі. Многія літара□тары ў такім узросце толькі пачынаюць тварыць. Ён жа — закончыў. І можа, **таму**, **што** прадчуваў блізкую развязку, спяшаўся, працаваў не шкадуючы **сябе**: абы паспець сказаць **тое**, **што** хвалявала **яго** сэрца і што не магло не выліцца ў творы.*

*У **яго** не было зацягнутага перыяду вучнёўства. (А. Бачыла)*

1. *(Кароткім быў) **яго** (век)* — займеннік; **у застылай форме м. р., адз. л., Р. скл;** абагульнена-якасны, прыналежны; **мае значэнне м. р., адз. л., Н. скл.; прымыкае** да назоўніка *век*; у сказе выконвае сінтаксічную функцыю **недапасаванага азначэння.**

Займеннік ***яго*** тут з лёгкасцю замяняецца на адпаведны яму прыналежны займеннік ***ягоны***, адкуль выразна відаць разрад і родавае, лікавае, склонавае значэнне дадзенага займенніка ***яго*** *(век)*.

2. *(…тое, што хвалявала) **яго** (сэрца)* — займеннік; **у застылай форме м. р., адз. л., Р. скл;** абагульнена-якасны, прыналежны; **мае**

Репозиторий ВГУ

значэнне н. р., адз. л., В. скл.; прымыкае да назоўніка *сэрца*; у сказе выконвае сінтаксічную ролю **недапасаванага азначэння.**

Тут аманімічная форма займенніка ***яго*** адпавядае прыналежнаму займенніку ***ягонае***, па якім лёгка можна вызначыць родавае, лікавае і склонавае значэнне дадзенага займенніка ***яго*** *(сэрца)*.

Правільна вызначыць **склонавае значэнне** ў прыведзеных займенніках, а таксама пры разборы любой скланяльнай часціны мовы дапамагае **прыём падстаноўкі** ў дадзены кантэкст **назоўніка 1-га скланення ж. р. адз. ліку,** напрыклад: *кароткая была* ***яго*** *(= ягон**ая**) разлук**а*** — Н. скл.; *тое, што хвалявала* ***яго*** *(= ягон**ую**) душ**у*** — В. скл.

3. *(У)* ***яго*** *(не было перыяду)* — займеннік; **пач. ф. — ён;** абагульнена-прадметны, асабова-ўказальны; **ужыты ў форме** м. р., адз. л., Р. скл.; **разам з прыназоўнікам *у*** выконвае сінтаксічную функцыю ўскоснага дапаўнення.

У адрозненне ад папярэдніх двух прыкладаў, тут аманімічны займеннік ***яго*** з'яўляецца зменным, адказвае на пытанне *у каго ?* і **не** замяняецца прыналежнымі займеннікамі, не мае значэння прыналежнасці. Праверыць вызначэнне формы яго склону таксама дапамагае прыём падстаноўкі назоўніка 1-га скланення, ж. р., адз. л.: *У* ***яго*** *не было = У цётк**і** не было* (Р. скл.).

4. *(…можа, таму,)* ***што*** *(прадчуваў развязку)* — у гэтым сказе слова ***што*** не займеннік, а злучнік; падпарадкавальны, вытворны (паходзіць ад займенніка *што*), просты, адзіночны; звязвае даданую частку складаназалежнага сказа з галоўнай.

5. У гэтым жа кантэксце прыслоўе прычыны ***таму*** можна зблытаць з адпаведным займеннікам. Карыстаючыся прыёмам замены, пераконваемся: тут беларускаму прыслоўю ***таму*** адпавядае ў рускай мове прыслоўе ***потому;*** яго можна замяніць іншым прыслоўем (напрыклад: *можа,* ***нездарма,*** *бо…*). Яно адказвае на пытанні *чаму? з якой прычыны?* і з'яўляецца акалічнасцю прычыны.

6. *(…сказаць тое,)* ***што*** *(хвалявала яго сэрца)* — займ., пач. ф. — *што*, абагульнена-прадметны, адносны; ужыты ў форме Н. скл.; у сказе з'яўляецца адносным словам (звязвае даданую частку складаназалежнага сказа з галоўнай), выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка.

Па-ранейшаму правяраецца правільнасць вызначэння склонавай формы і сінтаксічнай функцыі: ***што*** *хвалявала яго сэрца = песня хвалявала яго сэрца* (Н. скл., дзейнік).

7. *(…сказаць)* ***тое***, *(што…)* — **назоўнік,** пач. ф. — *тое*; агульны, неадушаўлёны, абстрактны; ніякага роду, ад'ектыўнага скланення, адзіночналікавы; ужыты ў форме В. скл.; выконвае сінттаксічную ролю прамога дапаўнення.

Репозиторий ВГУ

Праверка правільнасці вызначэння склонавай формы і сінтаксічнай ролі: *…сказаць* ***тое*** = *…сказаць праўду* (В. скл.).

Пра тое, што перад намі **назоўнік, а не ўказальны займеннік,** сведчаць 1) склонавае пытанне *што?* ; 2) лексічнае значэнне абстрактнага аб'екта; 3) немагчымасць змяніць род і лік слова *тое* без змены яго лексічнага значэння — значэння абстрактнасці; 4) сінтаксічная роля прамога дапаўнення, а не азначэння.

8. *(…працаваў не шкадуючы)* ***сябе*** — займ.; пач. ф. — *сябе*; абагульнена-прадметны, зваротны; ужыты ў форме Р. скл.; **уваходзіць у склад** акалічнасці спосабу дзеяння *не шкадуючы сябе*.

ПАРАДАК І ЎЗОРЫ МАРФАЛАГІЧНАГА РАЗБОРУ ЧАСЦІН МОВЫ

НАЗОЎНІК

Парадак разбору

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (Н. скл., адз. л.).
3. Лексіка-граматычныя разрады:
   1) агульны ці ўласны;
   2) адушаўлёны ці неадушаўлёны;
   3) канкрэтны ці абстрактны;
   4) асабовы ці неасабовы;
   5) зборны;
   6) рэчыўны;
   7) адзінкавы.
4. Пастаянныя (сталыя, нязменныя) марфалагічныя прыметы: род, скланенне.
5. Форма ліку, склону.
6. Сінтаксічная функцыя ў сказе.

Узоры разбору

Кожны чалавек нараджаецца пад сваёй ***Зоркай****, той, пад якой упершыню прамаўляе яго імя на сваёй мове* ***Маці****. Той, хто цураецца сваёй мовы,— здраджвае сваёй* ***Маці****, сваім* ***Продкам****, свайму* ***Небу****. …Ніводзін на свеце народ не шануе* ***здрайцаў****.*

Репозиторий ВГУ

Самыя ***шчырыя*** *ўзаемаадносіны паміж* ***бацькамі*** *і дзецьмі адмалку і назаўсёды ”праграмуюцца” тым універсальным кодам, які выпрацаваны моваю продкаў.*

…Калі ў праграме ***ЭВМ*** *ёсць памылка, то яна будзе гнаць іх усё з* ***большым*** *і большым абвалам.* ***Гэткае*** *можа здарыцца і з* ***чалавечай*** *душой, калі без ніякай патрэбы памяняць у ёй знакава-генную інфармацыю. (А. Лісіцкі. ЛіМ, 30. 06. 1995)*

☝ 1. *(…здраджвае сваёй) Маці* — назоўнік, +**нязменны**; адушаўлёны, канкрэтны, асабовы, у значэнні ўласнага; +**жаночага роду, нулявога скланення; +мае значэнне** адз. ліку, Д. склону; у сказе выконвае сінтаксічную функцыю ўскоснага дапаўнення.

2. *(Ніводзін на) свеце (народ)* — назоўнік, пач. ф. — *свет*; агульны, неадушаўлёны, абстрактны; +м. роду, 2-га склан., **адзіночналікавы**; ужыты ў застылай форме М. скл.; уваходзіць у склад дапасаванага азначэння *ніводзін на свеце*.

3. *(…не шануе) здрайцаў* — наз., пач. ф. — *здрайца*; агульны, адуш., канкр., асабовы; +**агульнага роду,** рознаскланяльны (калі муж. полу) ці 1-га склан. (калі жан. полу); ужыты ў форме мн. л., В. скл.; выконвае сінтаксічную функцыю прамога дапаўнення.

4. *(…ўзаемаадносіны паміж) бацькамі (і дзецьмі)* — наз., пач. ф. — *бацькі*; агульны, адуш., канкр., асабовы; **множналікавы, па-за тыпамі скланення**; ужыты ў форме Т. скл.; уваходзіць у склад недапасаванага азначэння *паміж бацькамі і дзецьмі*.

☝5. *(…ў праграме) ЭВМ (ёсць памылка)* — наз., +**нязменны**; +**агульны**, неадушаўлёны, канкрэтны; +жаночага роду, нулявога скланення; + **мае значэнне** адз. л., Р. скл.; выконвае сінт. ролю недапасаванага азначэння.

6. *Гэткае (можа здарыцца)* — **назоўнік** (субстантываваны займеннік), пач. ф. — *гэткае*; агульны, неадуш., абстр.; н. р., ад’ектыўнага скланення, адзіночналікавы; ужыты ў форме Н. скл.; у сказе з’яўляецца дзейнікам.

Каментарыі да ўзораў разбору назоўнікаў

1. Адрозненне агульных назоўнікаў ад уласных звычайна не выклікае цяжкасцей дзякуючы арфаграфічнай прыкмеце —

Репозиторий ВГУ

напісанню іх з малой ці з вялікай літары. Сумненні ў студэнтаў звычайна выклікаюць 2 выпадкі:

1) калі семантыка агульнага ці ўласнага назоўніка **не падтрымліваецца арфаграфічнай прыкметай,** напрыклад:

☝ а) калі ў л а с н ы я назоўнікі напісаны з м а л о й л і т а р ы: *Ён вучыўся ў сярэдняй школе № 1 г. Пе□трыкава; Карэспандэнцыя была паслана ў газету "Беларуская вёска" (Бяд.); медаль "За адвагу"; сустракалі Новы год* — тут назоўнікі *школе, вёска, адвагу, год* у л а с н ы я, бо індывідуалізаваныя назвы прадметаў тут выражаны цэльнымі спалучэннямі слоў, якія ўяўляюцца намі прадметна, выступаюць як субстантываваныя адзінкі маўлення;

☝ б) наадварот, а г у л ь н ы я назоўнікі напісаны з в я л і к а й л і т а р ы: *Але мы не ведаем соцень тых Пушкіных і Талстых, якія былі ў гушчы працоўных (Крап.); Былі і свае Чацкія, Арбеніны (Ракітны); Забурліла сіне мора ад віхроў, выйшлі Волгі, Дняпры выйшлі з берагоў (Куп.)* — тут падкрэсленыя назоўнікі з'яўляюцца а г у л ь н ы м і, як і ў іншых выпадках пераходу ўласных назоўнікаў у агульныя, калі яны выкарыстоўваюцца для абагульненага абазначэння многіх асоб ці прадметаў з аднолькавымі рысамі характару ці з тыповымі рысамі грамадскага жыцця. Параўн. з агульнымі назоўнікамі ў такім жа значэнні, але напісанымі з малой літары: *Верыш ты розным нарбутовічам ды мартыневічам (Чарн.); …да самых далёкіх амерык (Калачынскі);* [1]

2) выпадкі напісання **з вялікай літары** назоўнікаў, якія звычайна **не з'яўляюцца індывідуальнымі назвамі** прадметаў, але **ў пэўным кантэксце індывідуалізуюцца.** Гэта такія словы, як *Айчына, Воля, Заўтра, Радзіма, Мова, Хлеб, Космас, Ён* і іншыя. У прыведзеным намі вышэй кантэксце гэта ў л а с н ы я назоўнікі *Зоркай, Маці, Продкам, Небу.* Тут мы маем справу з выпадкамі пераходу слоў з аднаго разраду ў другі. Такі пераход неабходна адзначаць у разборы. Як вядома, у л а с н ы я назоўнікі — гэта індывідуальныя назвы, якія вылучаюць, выдзяляюць прадмет з шэрагу аднародных. У прыведзеным вышэй кантэксце назоўнікам *Зоркай, Маці, Продкам, Небу* нададзены своеасаблівы сэнс, і гэтай своеасаблівай стылёвай афарбоўкай, гэтай сваёй індывідуалізацыяй значэння названыя назоўнікі вылучаюцца з шэрагу аднародных, г. зн. **набылі значэнне ўласных,** з разраду агульных перайшлі ў разрад уласных.

2. Пэўную цяжкасць нярэдка выклікае ў студэнтаў размежаванне к а н к р э т н ы х і а б с т р а к т н ы х назоўнікаў, бо за аснову размежавання студэнты бяруць крытэрый — успрымаецца ці не

[1] Гл.: Наркевіч А. І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы. — Мн., 1976, с. 19 – 24.

Репозиторий ВГУ

ўспрымаецца органамі пачуццяў тое, што абазначана назоўнікам. Калі кіравацца такім крытэрыем, то к а н к р э т н ы я назоўнікі *вечар, раніца, дзень, метад, свята, захворванне, рэвалюцыя, штуршок* і г. д. прыйшлося б адносіць да абстрактных, бо абазначаемыя імі паняцці, дзеянні, стан не ўспрымаюцца органамі пачуццяў.

Тут трэба **адрозніваць абстрактнасць / канкрэтнасць на лексічным узроўні і на граматычным.** У лексікалогіі і словаўтварэнні многія словы адносяцца да разраду абстрактнай лексікі (напр., вышэй прыведзеныя словы, а таксама падобныя да іх *запал**енне**, паўста**нне**, адказ**Ø**, напад**Ø**, прыступ**Ø**, выдум**ка**, заслуг**Ø**а, засух**Ø**а, заня**так*** і г. д.), а на граматычным узроўні яны класіфікуюцца як канкрэтныя, бо ў граматыцы ў аснове размежавання канкрэтных і абстрактных назоўнікаў ляжыць, акрамя крытэрыя ўспрыняцця органамі пачуццяў, яшчэ адзін крытэрый — **здольнасць утвараць дзве формы ліку** (адз. л. і мн. л.) **і спалучацца з уласнаколькаснымі лічэбнікамі.** Вышэй пералічаныя назоўнікі падаюцца лічэнню, маюць формы адз. л. і мн. л., таму адносяцца да канкрэтных, нягледзячы на абстрактнасць іх з семантычнага боку.

Зыходзячы з гэтага, адзіночналікавы назоўнік *свет* вышэй класіфікуецца намі пры марфалагічным разборы як абстрактны, а *неба* (мн. л. *нябёсы*) — як канкрэтны.

☝ 3. Улічваючы, што **р о д** у назоўнікаў — катэгорыя пастаянная (г. зн. назоўнікі **не змяняюцца па родах**), нелагічна характарызаваць н а з о ў н і к і а г у л ь н а г а р о д у як ”ужытыя ў мужчынскім (жаночым) родзе”. Іншая справа, што ў залежнасці ад полу абазначаемай імі асобы такія назоўнікі могуць адрозніваццa скланеннем.

Калі з кантэксту няясны пол асобы, то пры разборы такога назоўніка пажадана ўказваць тып скланення (калі ён не супадае) асобна для мужчынскага і асобна для жаночага полу. Напр., назоўнік агульнага роду *здрайцаў* у нашым кантэксце заключае ў сабе значэнні асоб і аднаго, і другога полу, таму ў разборы ўказваецца тып скланення асобна для кожнага полу.

4. Трэба адрозніваць множналікавы назоўнік *бацькі* са значэннем ’*бацька і маці*’ (руск. *родители*) ад рознаскланяльнага назоўніка *бацька* які змяняецца па ліках: *адзін бацьк**а**, тры (чатыры) бацьк**і**, пяць бацьк**оў***.

5. Пры абазначэнні р о д у а б р э в і я т у р неабходна асцерагацца тыповай памылкі, калі вызначаецца род па апорным слове расшыфроўкі ва ўсіх абрэвіятурах без выключэння.

У зменных абрэвіятурах тыпу *ЦУМ, МАЗ, філфак* род трэба вызначаць, як і ў любым скланяльным назоўніку, **па канчатку і характары асновы**, а ў нязменных тыпу *ВДУ, ВКЛ, сельпо* — па апорным слове расшыфроўкі (гл., напр., разбор назоўніка *ЭВМ*).

Репозиторий ВГУ

П Р Ы М Е Т Н І К

П а р а д а к р а з б о р у

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (Н. скл., адз. л., м. р.).
3. Лексіка-граматычны разрад:
   1) якасны;
   2) адносны;
   3) прыналежны: а) уласнапрыналежны; б) адносна-прыналежны;
4. У поўнай, кароткай ці ўсечанай форме.
5. Форма ступені параўнання (калі ёсць): у простай ці складанай форме вышэйшай ці найвышэйшай ступені параўнання.
6. Форма ацэнкі і меры якасці (калі ёсць).
7. Марфалагічныя прыметы: +**форма** роду, ліку, склону.
8. Сінтаксічная сувязь з назоўнікам (займеннікам).
9. Сінтаксічная функцыя ў сказе.

У з о р ы р а з б о р у

(Гл. тэкст на с. 9)

1. *Самыя шчырыя (ўзаемаадносіны ”праграмуюцца”)* — прыметнік, пач. ф. — *шчыры*; якасны; ужыты ў поўнай форме, у складанай форме найвышэйшай ступені параўнання, у мн. л., Н. скл.; дапасуецца да назоўніка *ўзаемаадносіны* ў ліку і склоне; выконвае сінтаксічную функцыю дапасаванага азначэння.

2. *(…будзе гнаць усё з) большым (і большым абвалам)* — прыметнік, пач. ф. — *вялікі*; якасны; ужыты ў поўнай форме, у простай форме найвышэйшай ступені параўнання, у м. р., адз. л., Т. скл.; дапасуецца да назоўніка *абвалам* у родзе, ліку і склоне; разам з узмацняльнай часціцай *усё* выконвае сінтаксічную ролю дапасаванага азнаэння.

3. *(…здарыцца і з) чалавечай (душой)* — прыметнік, пач. ф. — *чалавечы*; ☝ **адносна-прыналежны;** ужыты ў поўнай форме, у ж. р., адз. л., Т. скл.; дапасуецца да назоўніка *душой* у родзе, ліку і склоне; выконвае сінтаксічную функцыю дапасаванага азначэння.

Валя ўхуталася ў матчын новы кажух… (Саб.).

4. *(…ўхуталася ў) матчын (кажух)* — прыметнік, пач. ф. — *матчын*; ☝ **уласнапрыналежны;** ужыты **ў кароткай** форме, у м. р., адз. л., В. скл.;

Репозиторий ВГУ

дапасуецца да назоўніка *кажух* у родзе, ліку і склоне; выконвае сінтаксічную функцыю дапасаванага азначэння.

У графіцы стыль барока найбольш выявіўся ў кніжнай гравюры (ЭЛіМБел).

5. *(…стыль) барока (выявіўся)* — прыметнік, ☝ **нязменны,** адносны; **мае значэнне** м. р., адз. л., Н. скл.; прымыкае да назоўніка *стыль*; выконвае сінтаксічную ролю недапасаванага азначэння.

Каментарыі да ўзораў разбору прыметнікаў

1. Пры вызначэнні лексіка-граматычнага разраду прыметнікаў неабходна ўлічваць не толькі іх фармальны бок, але і семантычны. Пры фармальна-семантычным падыходзе трэба памятаць, што адзін і той жа прыметнік у залежнасці ад кантэксту можа мець рознае значэнне і таму адносіцца да розных лексіка-граматычных разрадаў. Напрыклад: *лісіная галава* — уласнапрыналежны (абазначае частку цела жывёлы), *лісіныя сляды* — адносна-прыналежны (абазначае родавую прыналежнасць), *лісіны каўнер* — адносны (абазначае адносіны да матэрыялу), *лісіная хітрасць у чалавека* — якасны (пераносны сэнс, абазначае ўнутраную якасць чалавека).

Прааналізаваны вышэй прыметнік *матчын (кажух)* уласнапрыналежны, абазначае індывідуальную прыналежнасць прадмета асобе; у іншым кантэксце ён можа быць адносна-прыналежным, напрыклад: *матчыны парады* — родавая прыналежнасць, г. зн. парады ўсіх мацярок, любой маці. Прыметнік *чалавечай (душой)* адносна-прыналежны, бо абазначае ў прыведзеным кантэксце родавую прыналежнасць.

2. У беларускай мове нормай з'яўляецца ўжыванне ўласнапрыналежных прыметнікаў у Н. і В. склонах у кароткай форме, таму для іх менавіта кароткая форма з'яўляецца пачатковай, напр.: *матчын (кажух)*. Для астатніх разрадаў пачатковай з'яўляецца поўная форма.

3. Нязменныя прыметнікі тыпу *барока, хакі, комі, плісэ, клёш* і г. д. трэба адрозніваць ад адпаведных назоўнікаў, з якімі яны суадносяцца па паходжанні. Адрозніваць іх можна па пытаннях, па функцыі ў сказе, па сінтаксічнай сувязі са словамі. **Нязменныя назоўнікі** сінтаксічна звязаны з дзеясловамі, адказваюць на склонавыя пытанні і ў сказе з'яўляюцца, як правіла, дзейнікам або дапаўненнем. А **нязменныя прыметнікі** залежаць ад назоўнікаў, адказваюць на пытанне *які?* і ў сказе з'яўляюцца, як правіла, азначэннем. Параўнаем: *стыль (які?) барока; штаны (якія?) галіфэ; мова (якая?) комі* — прыметнікі; *беларускае (што?) барока адрозніваецца ад заходнееўрапейскага; пашылі (што?) новае галіфэ; вывучыць (што?) комі* — назоўнікі.

Репозиторий ВГУ

Л І Ч Э Б Н І К

П а р а д а к р а з б о р у

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма — Н. скл., м. р.(калі змяняецца па родах), адз. л. (калі змяняецца па ліках).
3. Лексіка-граматычны разрад:
   1) колькасны (уласнаколькасны, зборны, дробавы);
   2) парадкавы;
4. Разрад па структуры: просты, складаны або састаўны.
5. Разрад па паходжанні і ўтварэнні: невытворны або вытворны; ад чаго ўтвораны.
6. Марфалагічныя прыметы: +**форма** склону, роду (калі ёсць), ліку (калі ёсць).
7. Сінтаксічная сувязь лічэбніка з назоўнікам (у дужках канкрэты-заваць, **у чым** дапасуецца або **як** кіруе).
8. Сінтаксічная функцыя ў сказе.

У з о р ы р а з б о р у

*У Рэспубліцы Беларусь **7** лістапада афіцыйна застаецца чырвоным днём календара. […] **Абедзве** рэвалюцыі **1917** года вытлумачваюцца вайною, рэзрухам, беззямеллем сялян. Але ёсць рэвалюцыя і ёсць катастрофа. Рэвалюцыя вызваляе сілы, неабходныя для развіцця грамадства, а катастрофа знішчае **іх**. У кастрычніку **1917** года многія адмоўныя акалічнасці супалі, і на звычайную нармальную рэвалюцыю (лютаўскую), **якая** была спароджана сапраўднымі, аб'ектыўнымі прычынамі, наклалася вучэнне марксізму-ленінізму, што і надало **ёй** характар катастрофы. …Пра **ўсялякую** падзею мяркуюць па **яе** выніках. У 1913 годзе Расія займала па розных паказчыках жыццёвага ўзрозню 5-е – **13-е** месцы. А "итоги большого пути" выглядаюць гэтак: па вытворчасці валавога прадукта на душу насельніцтва ў 1985 годзе СССР займаў 68-е месца ў свеце, а па ўзроўні асабістага спажывання — **77-е**. У наступныя гады становішча катастрафічна пагоршылася, і **мы** скаціліся на дзесяткі прыступак ніжэй. І ўсё **гэта** з прычыны "вялікай" падзеі, **што** здарылася **79** гадоў назад.*

ЛіМ, 29. 11. 1996.

1. …*сёмага (лістапада застаецца чырвоным днём)* — лічэбнік, пач. ф. — *сёмы*; парадкавы, просты, вытворны (ад колькаснага *сем*);

Репозиторий ВГУ

ужыты ў застылай форме м. р., адз. л., Р. скл.; дапасуецца да назоўніка *лістапада* ў родзе, ліку і склоне; у сказе ўваходзіць у склад дзейніка *сёмага лістапада*.

2. *Абедзве (рэвалюцыі вытлумачваюцца)* — лічэбнік, пач. ф. — *абодва*; колькасны (зборны), складаны, вытворны; ужыты ў форме ж. р., Н. скл.; дапасуецца да назоўніка *рэвалюцыі* ў родзе і склоне; у сказе ўваходзіць у склад дзейніка *абедзве рэвалюцыі*.

3. *(Абедзве рэвалюцыі) тысяча дзевяцьсот семнаццатага (года вытлумачваюцца)* — лічэбнік, пач. ф. — *тысяча дзевяцьсот семнаццаты*; парадкавы, састаўны, вытворны (ад сумы лічэбнікаў *тысяча, дзевяцьсот, семнаццаты*); ужыты ў застылай форме м. р., адз. л., Р. скл.; дапасуецца да назоўніка *года* ў родзе, ліку і склоне і разам з назоўнікам *года* прымыкае да назоўніка *рэвалюцыі*; у сказе ўваходзіць у склад недапасаванага азначэння *1917 года*.

4. *(…займала …пятае –) трынаццатае (месцы)* — лічэбнік, пач. ф. – *трынаццаты*; парадкавы, састаўны, вытворны (ад парадкавага *трынаццаць*); ужыты ў форме н. р., адз. л., В. скл.; дапасуецца да назоўніка *месца* ў родзе, ліку і склоне; выконвае сінт. функцыю дапасаванага азначэння.

5. *(…займаў) семдзесят сёмае (месца)* — лічэбнік, пач. ф. — *семдзесят сёмы*; парадкавы, састаўны, вытворны (ад лічэбнікаў *семдзесят* і *сёмы*); ужыты ў форме н. р., адз. л., В. скл.; дапасуецца да назоўніка *месца* ў родзе, ліку і склоне; выконвае сінт. функцыю дапасаванага азначэння.

6. *(…здарылася) семдзесят дзевяць (гадоў назад)* — лічэбнік, пач. ф. – *семдзесят дзевяць*; колькасны (уласнаколькасны), састаўны, вытворны (ад сумы двух колькасных *семдзесят* і *дзевяць*); ужыты ў форме В. скл.; кіруе назоўнікам *гадоў* (патрабуе ад яго формы мн. л., Р. скл.); у сказе ўваходзіць у склад акалічнасці часу 79 гадоў назад.

Каментарыі да ўзораў разбору лічэбнікаў

1. Лічэбнік *абедзве (абодва)* класіфікуецца як складаны на падставе параўнання яго з аднакаранёвым зборным лічэбнікам *абое (абоjэ)*.

2. Агульнавядома, што колькасныя лічэбнікі (а таксама няпэўна-колькасныя словы) разам з назоўнікам утвараюць сінтаксічна непадзельнае колькасна-іменнае словазлучэнне, якое з'яўляецца адным членам сказа.

Парадкавыя ж лічэбнікі, як правіла, з'яўляюцца асобным членам сказа, звычайна азначэннем (гл., напрыклад, разбор лічэбнікаў *13-е* і *77-е*). Але **пры абазначэнні дат, часу дзеяння парадкавы лічэбнік** разам з назоўнікам таксама **ўваходзіць у склад аднаго члена сказа,**

Репозиторий ВГУ

часцей за ўсё акалічнасці часу. Напрыклад, у сказе ”*У кастрычніку 1917 года многія адмоўныя акалічнасці супалі…*” **парадкавы** лічэбнік ***1917*** уваходзіць **у склад акалічнасці часу.** Значна радзей такія парадкавыя лічэбнікі могуць быць іншым членам сказа, як, напрыклад, у другім сказе ”*Абедзве рэвалюцыі 1917 года вытлумачваюцца…*” той жа лічэбнік *1917* разам з назоўнікам *года* набывае **якасна-адрознівальную прымету** і таму ўваходзіць у склад недапасаванага азначэння.

3. Калі колькасны ці парадкавы лічэбнік ужываецца ў сказе без назоўніка, то ён пераходзіць у іншую часціну мовы, часцей у назоўнік, напрыклад: *двое маўчалі* (наз.); *першы выйшаў, а другі застаўся* (наз.); *вярнуліся адны мы* (часціца); *дзеці ў лес пайшлі адны* (прыслоўе) і г. д.

Такія выпадкі пераходу лічэбнікаў у іншыя часціны мовы трэба адрозніваць ад ужывання лічэбнікаў у сваім прамым значэнні, калі непасрэдна пры аналізуемым лічэбніку **назоўнік прапушчаны, але стаіць пры іншым лічэбніку** ў гэтым жа сказе або ў папярэднім кантэксце і таксама адносіцца да аналізуемага лічэбніка. Прыкладам можа служыць у прыведзеным намі тэксце парадкавы лічэбнік *77-е*, пры якім непасрэдна няма назоўніка, але слова *месца*, што стаіць пры лічэбніку *68-е*, адносіцца таксама і да лічэбніка *77-е*.

4. Правільнасць вызначэння склонавай формы лічэбніка *79* (В. скл.) у кантэксце ”*здарылася 79 гадоў назад*”, а таксама любога іншага лічэбніка можна праверыць шляхам замены, падставіўшы ў кантэкст лічэбнік *адна тысяча* (або словазлучэнне *адна хвіліна*), бо ён змяняецца гэтак жа, як назоўнікі **ж. р. 1-га скланення,** канчаткі якіх выразна выяўляюць склон, асабліва адрозніваюцца ў В. і Н. склонах. Напрыклад: ”*здарылася адну тысячу гадоў назад*”, ”*здарылася адну хвіліну назад*” — В. скл.

ЗАЙМЕННІК

Парадак разбору

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма — Н. скл., м. р. (калі змяняецца па родах), адз. л. (калі змяняецца па ліках).
3. Разрад па суадносненасці з часцінамі мовы:
   1) абагульнена-прадметны;
   2) абагульнена-якасны;
   3) абагульнена-колькасны.
4. Лексіка-граматычны разрад (або разрад па значэнні):
   1) асабовы (уласнаасабовы ці асабова-ўказальны);
   2) зваротны;
   3) прыналежны;
   6) пытальны;
   7) адносны;

Репозиторий ВГУ

4) указальны;
5) азначальны;
8) адмоўны;
9) няпэўны (або неазначальны).

5. Пастаянныя граматычныя прыметы: для ўсіх **асабовых —** асоба; для ўласнаасабовых — асоба і лік.
6. Непастаянныя граматычныя прыметы: **форма** склону, роду (калі ёсць), ліку (калі ёсць).
7. Сінтаксічная сувязь займенніка з назоўнікам (для абагульнена-якасных і абагульнена-колькасных).
8. Сінтаксічная функцыя ў сказе.

Узоры разбору

(Гл. тэкст на с. 15)

1. *(…знішчае) іх* — займеннік, пач. ф. — *ён*; абагульнена-прадметны, асабова-ўказальны; 3-й асобы; ужыты ў форме мн. л., В. скл.; у сказе выконвае сінтаксічную ролю прамога дапаўнення.

2. *(…рэвалюцыю,) якая (была спароджана)* — займеннік, пач. ф. — *які*; абагульнена-якасны па форме і абагульнена-прадметны па значэнні, адносны; ужыты ў форме ж. р., адз. л., Н. скл.; дапасуецца да назоўніка *рэвалюцыю* ў родзе і ліку; у сказе выконвае сінтаксічную ролю дзейніка.

3. *(…надало) ёй (характар)* — займеннік, пач. ф. — *ён*; абагульнена-прадметны, асабова-ўказальны; 3-й асобы; ужыты ў форме ж. р., адз. л., Д. скл.; у сказе выконвае сінтаксічную функцыю ўскоснага дапаўнення.

4. *(Пра) ўсялякую (падзею мяркуюць)* — займеннік, пач. ф. — *усялякі*; абагульнена-якасны, азначальны; ужыты ў форме ж. р., адз. л., В. скл.; дапасуецца да назоўніка *падзею* ў родзе, ліку і склоне; у сказе выконвае сінтаксічную функцыю дапасаванага азначэння.

5. *(…мяркуюць па) яе (выніках)* — займеннік, ☝ **у застылай форме ж. р., адз. л., Р. скл.**; абагульнена-якасны, прыналежны; ☝**мае значэнне мн. л., М. скл.**; прымыкае да назоўніка *выніках*; у сказе выконвае сінтаксічную функцыю недапасаванага азначэння.

6. *Мы (скаціліся)* — займеннік, пач. ф. — *мы*; абагульнена-прадметны, уласнаасабовы; 1-й асобы, ☝ **мн. ліку**; ужыты ў форме Н. скл.; у сказе з'яўляецца дзейнікам.

7. *(І ўсё) гэта (з прычыны …падзеі)* — займеннік, пач. ф. — *гэты*; абагульнена-якасны, указальны; ужыты ва ўсечанай форме, у н. р., адз. л., Н. скл.; дапасуецца да назоўніка (субстантываванага займенніка) *ўсё* ў родзе, ліку і склоне; у сказе выконвае сінт. ролю дапасаванага азначэння.

8. *(…падзеі) што (здарылася)* — займеннік, пач. ф. — *што*; абагульнена-прадметны, адносны; ужыты ў форме Н. скл.; у сказе з'яўляецца дзейнікам.

Репозиторий ВГУ

Каментарыі да ўзораў разбору займеннікаў

☝ 1. **У прыналежных займеннікаў *яго, яе, іх*** не трэба змешваць іх пастаянныя, застылыя формы са склонавым, лікавым і родавым значэннямі. Гэтыя значэнні могуць змяняцца пры змене кантэксту. Іх можна лёгка вызначыць шляхам замены застылых формаў на зменныя займеннікі, напрыклад: *яго — ягоны, ягоная, ягонае, ягоныя; іх — іхні (-яя, -яе, -ія); яе* — дыялектнае *ейны (-ая, -ае, -ыя)* або *мой, свой* і г. д. Замяняем: ”*мяркуюць па яе выніках*” — *мяркуюць па ейных (па маіх, тваіх, сваіх) выніках* — мн. л., М. скл.

2. Ва ўласнаасабовых займеннікаў *я, мы, ты, вы* катэгорыя ліку пастаянная, яны не змяняюцца па ліках. Семантычна ”***мы***” — гэта не ёсць сума некалькіх ”***я***”, гэтаксама ”***вы***” не ёсць мноства ”***ты***” (параўнаем з назоўнікамі: ”*сталы*” = суме ”*стол*” + ”*стол*” + ”*стол*” …), таму лік у займеннікаў *я, мы, ты, вы*, як і асоба, з’яўляецца нязменнай граматычнай катэгорыяй.

3. З пэўнай цяжкасцю вызначаецца студэнтамі **разрад па суадноснасці з часцінамі мовы** ў адносных займеннікаў *які, чый, каторы.* Звычайна разрад па суадноснасці з часцінай мовы вызначаецца сінтаксічна, па пытанні. Але **пытанне**, пастаўленае да названых адносных займеннікаў **у сказе** і да гэтых жа слоў **без кантэксту,** можа не супадаць. У такім разе пажадана ўказваць і фармальную (абагульнена-якасны), і семантычную (абагульнена-прадметны) суадноснасць з часцінамі мовы, як гэта зроблена ў прыведзеным вышэй разборы займенніка *якая*.

4. Хаця ўказальны займеннік *гэта* ў кантэксце ”*І ўсё гэта з прычыны …падзеі…*” часткова страціў сваё лексічнае значэнне займенніка і функцыю дапасаванага азначэння, знаходзіцца на стадыі пераходу ва ўзмацняльную часціцу, тым не менш ён класіфікуецца намі як займеннік, бо адначасова яшчэ захоўваецца ягонае першаснае значэнне ўказальнага займенніка. Тут, як і ў многіх іншых **выпадках частковага пераходу** з адной часціны мовы ў другую ці з аднаго разраду часціны мовы ў другі, не можа быць катэгарычных адказаў, адназначных меркаванняў. У такіх выпадках пры разборы пажадана асцерагацца строгага педантызму, бо, як слушна сцвярджаў доктар педагагічных навук прафесар А. В. Цекучоў, далёка не заўсёды можна ўціснуць у зараней падрыхтаваныя схемы ўсе шматлікія з’явы жывой мовы.

5. Каб адрозніць адносны займеннік *што* (а гэтаксама і займеннік *які*) у кантэксце ”*…падзеі, што здарылася…*” ад адпаведнага злучніка, можна выкарыстаць 1) **прыём падстаноўкі:** падставіць у даданую частку замест адноснага займенніка слова з галоўнай часткі, якому адпавядае гэты займеннік, напрыклад: ”*…падзеі, што здарылася…*” — *падзея здарылася* (Н. скл., дзейнік);

Репозиторий ВГУ

2) **прыём замены:** паглядзець, якою часцінай мовы замяняецца аналізуемае слова: калі займеннікам — то перад намі адносны займеннік, а калі злучнікам — то і аналізуемае слова з'яўляецца падпарадкавальным злучнікам, напрыклад: "*…падзеі, што (якая, каторая) здарылася…*" — займеннікі; 3) **прыём сінтаксічнага разбору** даданай часткі: выясніць, ці з'яўляецца гэтае адноснае слова **членам сказа.** Калі з'яўляецца, то гэта сведчыць пра яго прыналежнасць да займеннікаў, а не да злучнікаў. У нашым выпадку злучальнае слова *што* адказвае на пытанне *што?* і з'яўляецца дзейнікам у даданай частцы.

КАНТРОЛЬНАЯ РАБОТА №1 ПА МАРФАЛОГІІ (ІМЕННЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ)

ЗАДАННЕ. Зрабіць поўны марфалагічны разбор падкрэсленых у тэксце слоў.

Варыянт 1

Павел *Восіпавіч Сухі*… Геніяльны канструктар-наватар, зорка сусветнай авіяцыі. За *сваё* жыццё ён стаў аўтарам *50* арыгінальных самалётаў, больш за *30* з *якіх* былі выраблены і выпрабаваны. Кожную сваю мадэль Сухі надзяляў *нечым* рэвалюцыйным, зусім новым, не традыцыйным для тагачаснай авіяцыі. Абганяў *свой* час! На *яго* машынах устанаўлівалі *сусветныя* рэкорды скорасці і вышыні палёту, яны бязлітасна знішчалі ворага ў гады *Вялікай* Айчыннай вайны, самалёты з маркай "*СУ*" добра *вядомыя* і сёння.

Быў Павел Восіпавіч чалавекам надзвычай сціплым, неназойлівым, ніколі не хадзіў у "любімчыках", доўгі час *яго* праца была строга засакрэчана, але талент браў сваё: яркая асоба прыкметна вылучалася сярод канструктараў.

Такім земляком ганарыцца трэба, а беларусы *яго* амаль не ведаюць. Яму б помнік пры жыцці паставіць (двойчы Герой Сацыялістычнай *Працы*, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій *СССР*), але ў *Мінску* няма ні вуліцы *яго* імя, ні нават мемарыяльнай дошкі…

Нарадзіўся П. В. Сухі 10 ліпеня *1895* года ў мястэчку *Глыбокае*, *што* на Віцебшчыне. У 1995 годзе авіяцыйны свет адзначыў *100-гадовы* юбілей геніяльнага авіяканструктара. *(Звязда, 21 ліпеня 1995)*

Варыянт 2

Вяртанне святыні

Репозиторий ВГУ

Адрадзіць *адну* з *найвялікшых* беларускіх святыняў узяўся брэсцкі мастак *Мікалай Кузьміч*.

…Жыў у старажытным *Полацку* ў даўнія часы Лазар Богша. Па *заказе* прападобнай княгіні Еўфрасінні зрабіў ён у *1161* годзе крыж, *які* стаў *шэдэўрам* старажытнага беларускага мастацтва. Аснова *яго* *драўляная*, сам жа ён пакрыты каляровай эмаллю, а па ёй — срэбра, золата, каштоўныя камяні. *Вызначальныя* ювелірна выкананыя надпісы, *адзін* з *якіх* гаворыць: ”Няхай жа не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, і не аддаюць. Калі не паслухае *хто* і вынесе з манастыра, няхай не паможа яму святы крыж ні ў жыцці *гэтым*, ні ў будучым, няхай пракляты ён будзе…”

Стагоддзі прабыла рэліквія ў Полацку. Але ўжо ў *20-ыя* гады XX стагоддзя за *яе* актыўна ўзяліся ”ваяўнічыя атэісты”. У гады ж вайны сляды Крыжа і зусім згубіліся. Невядома, дзе *ён* цяпер і *каго* карае сваёй прыгажосцю.

У *гэтых* настойлівых пошуках *нашым* суайчыннікам тайнаў майстра Лазара Богшы бачыцца сувязь часоў і пакаленняў. *(ЛіМ, 29. 07. 1994)*

Варыянт 3

Сённяшні Сцяг і *Герб* не маюць свайго ўласнага аблічча і ніяк не звязаны з нацыянальнымі традыцыямі, з гісторыяй *Беларусі*. Пагадзіцеся: не вялікі гонар, калі твой Дзяржаўны сцяг і твой Герб — амаль дакладна такія ж, як яшчэ цэлыя *пятнаццаць*.

Наконт старажытнага беларускага герба ”Пагоня”, *які* прапануецца зацвердзіць у якасці дзяржаўнага,— галоўная, бадай, заўвага зводзіцца к *наступнаму*: навошта ў руцэ конніка меч? На *каго* *ён* падняты? З кім збіраецца ваяваць наша Беларусь? Чаму не даць гэтаму конніку ў руку ну, скажам, паходню ці *вярбовую* галінку? Будзе, маўляў, больш адпавядаць мяккаму, добраму характару народа і *яго* міралюбівай *сучаснай* палітыцы. *Што* можна адказаць на *гэта*? *Тое*, што контраргумент крытыкі не вытрымлівае. Па *такой* логіцы можна паставіць пытанне перад многімі народамі свету, якія таксама не вызначаюцца ваяўнічасцю, але дзяржаўныя гербы *якіх* зусім не з анёльскімі выявамі. Так, *многія* краіны маюць на сваім гербе выяву страшнага драпежнага звера льва. Чаму — леў, а не, скажам, рахманая бязрогая авечка? У *некаторых* дзяржавах, у тым ліку і ў нашых суседзяў, на гербе — драпежны крывадзюбы арол. Зноў жа — чаму арол, а не той жа міраносец голуб ці, скажам, бяскрыўдны бусел? А таму, што і *адзін*, і *другі* вобраз увасабляюць дзяржаўную сілу-моц і дзяржаўную мудрасць, яны сталі выявамі на гербах менавіта тады, калі трэба было падкрэсліць і сваю *моц*, і сваю мудрасць, і з таго часу народы не ўсумніліся ў *правільнасці* выбару гэтых вобразаў,— з павагі да сваёй гісторыі, а гэта значыць да саміх *сябе*. Не ўсумніліся — і не сталі ў *іншым* гістарычным часе абнаўляць, перарабляць, мяняць свае дзяржаўныя атрыбуты на іншыя.

Репозиторий БГУ

(Н. Гілевіч)

Варыянт 4

Адно з *самых* *таямнічых* месцаў на *Зямлі* — пустыня Наска ў Перу з *яе* дзіўнымі геогліфамі. Геогліфы — гіганцкія малюнкі на зямлі, *якія* можна ўбачыць толькі з вышыні *птушынага* палёту. Малюнкі раскіданы на вялікім *плато* плошчай *500* кв. м. Час *іх* *стварэння* вызначыць вельмі цяжка. Для чаго зроблены такія *велізарныя* малюнкі? І *хто* мог бачыць іх? Сярод *іх* — выявы павука даўжынёй *50* м, арла ў 120 м, яшчаркі ў 180 м, малпы ў 100 м. Ёсць і фантастычныя жывёлы, і дзіўныя геаметрычныя фігуры. Зразумела, што яны выконвалі *культавыя* функцыі. *Некаторыя вучоныя* называюць малюнкі ”самым вялікім у свеце падручнікам астраноміі”. На *іх* думку, розныя спіралі сімвалізавалі галактыкі, жывёлы — сузор’і. Але найбольш вядомая гіпотэза належыць нямецкаму даследчыку, пісьменніку, кінарэжысёру *Эрыху* фон Дэнікену, *які* лічыць геогліфы разметкай для караблёў з *космасу*. Не менш фантастычная і *другая* тэорыя, паводле якой старажытныя жыхары *Перу* мелі лятальныя апараты тыпу паветраных шароў. *(Т. Шамякіна)*

Варыянт 5

Сёння *мы* справядліва лічым, што карані *таго* катастрафічнага стану беларускай мовы, *які* склаўся ў *рэспубліцы*, трэба шукаць не ў далёкай *мінуўшчыне*, а ў *першую* чаргу ў канцы *20-ых* і ў *30-ыя* гады.

Зараз вядома значна больш (але далёка не *ўсё*!) пра тыя часы, калі *самыя* *таленавітыя* прадстаўнікі нашага народа, *якія* стваралі матэрыяльны, *навуковы* і духоўны патэнцыял рэспублікі, пасля навешвання ярлыкоў ”нацдэмаў” знішчаліся фізічна. Хваля рэпрэсій кацілася па *Беларусі* і пасля вайны…

Будзем спадзявацца, што гісторыя скажа праўдзівае слова пра адносіны да лёсу нацый і народнасцей *СССР* ”бацькі *ўсіх* народаў” — Ягоды, *Яжова*, *Берыі*, *Кагановіча*, *Молатава*, Варашылава і *многіх іншых*, аслабаніць школьныя падручнікі і шматтомныя *акадэмічныя* навуковыя даследаванні ад цынічнай хлусні. І ўсё ж, як ні дзіўна, школы з беларускай мовай навучання ў гарадах і райцэнтрах рэспублікі тады яшчэ існавалі. *(С. Законнікаў)*

Варыянт 6

У *Грузіі*, на *Мтацміндзе*, ляжыць пліта, а на ёй — *адно* толькі слова ”*Акакій*”. І дастаткова. І болей нічога не трэба. Бо *кожны* грузін ведае, што тут, пад *ёю*, ляжыць *іх* вялікі Акакій *Цэрэтэлі*.

Репозиторий ВГУ

Успомнілася, што і ў *вялікіх людзей ранейшага* часу таксама *ўсё* было *проста*: Мікеланджэла, Рафаэль, Леанарда да Вінчы. Гэта ж таксама не прозвішчы, а ўсяго толькі *імёны*, па *якіх* сёння *мы* ведаем геніяў.

А зараз *каторы* як пачне пісаць пад сваім прозвішчам *усе* свае тытулы, як пачне пералічваць усе *свае* званні і пасады, дык часам г*эта* займае больш месца, чым уся тая заметка, *якую* ён стварыў і надрукаваў…

А можа, усё-такі прасцей трэба? ”Акакій”. І ўсё. І болей *нічога* не трэба. *(Я. Сіпакоў)*

ТАБЛІЦЫ І КАМЕНТАРЫІ ДА ІХ

Алгарытм

”РОД АБРЭВІЯТУР”

ЗМЕННАЯ

Па канчатку і характары асновы:

ЛіМ □
нэп □
МАЗ □
рыбгас □
дзяржстрах □

} **м. р.**

НЯЗМЕННАЯ

Па апорным слове расшыфроўкі:

ЭВМ
АТС
БелАМ

} **ж. р.**

РБС
РАУС
БДУ

} **м. р.**

МП
БЗВ
БелТА

} **н. р.**

Каментарый

Тыповай памылкай пры вызначэнні роду абрэвіятур з’яўляецца ігнараванне адлюстраванага вышэй алгарытма і вызначэнне роду любых абрэвіятур (у тым ліку і **зменных**) па апорным слове расшыфроўкі: ”*БАМ* — ж. р., бо апорнае слова *магістраль* — ж. р.”. **Гэта памылковы шлях** вызначэння роду абрэвіятур. *ВАЗ* — м. р. не таму, што ў гэтым назоўніку апорнае слова расшыфроўкі *завод*, а таму, што гэта зменная

Репозиторий ВГУ

абрэвіятура, пры скланенні назоўнікі *ВАЗ, БАМ, ЦУМ, ГУМ, ЛіМ, нэп, БелАЗ, рыбгас, прафкам* і пад. маюць такія ж канчаткі, як і ў простых (**не** складанаскарочаных) назоўнікаў **м. р.** тыпу *воз, стол.*

ТЫПЫ СКЛАНЕННЯ НАЗОЎНІКАЎ

I. СУБСТАНТЫЎНАЕ СКЛАНЕННЕ

1. Назоўнікі 1 - га скланення:

1) ж. р. на ***-а (-я)***: *хата, душа, нага, бабуля, сям'я;*

2) аг. р. жан. полу на ***-а (-я)***: *малайчы□на* (Іна), *со□ня* (Рая), *ляўша́* (Юля);

3) м. р. на **націскны** ***-а́ (-я́)***: *суддзя□ Ільяа□, тамада́ Кузьма́;*

4) аг. р. муж. полу на **націскны** ***-а́ (-я́)***: *сірата́* (Фама́), *размазня□* (Лука́)

2. Назоўнікі 2 - га скланення:

1) м. р. з нулявым канчаткам: *брат□, стол□;*

2) н. р. на ***-о, -а, -е, -ё*** **:** *акно, возера, поле, галлё;*

3) 5 назоўнікаў н. р. на ***-мя***: *вымя, семя, цемя, полымя, бярэмя;*

4) назоўнікі **м. р.** на ***-а*** з ацэначным суфіксам ***-ішч-***: *насішча, галасішча;*

5) асобныя назоўнікі **м. р.** на ***-о***: *Пятро, Дняпро*

3. Назоўнікі 3 - га скланення:

ж. р. з нулявым канчаткам: *печ□, мыш□, сенажаць□*

4. Рознаскланяльныя назоўнікі:

1) м. р. на **ненаціскны** ***-а (-я)***: *ваявода Дані□ла, дзя□дзя Ва́ня;*

2) аг. р. муж. полу на **ненаціскны** ***-а (-я)***: *запява́ла* (Мікі□та), *ціхо́ня* (Ві□ця);

3) тры назоўнікі **н. р.** на ***-мя***: *імя□, племя, стрэмя;*

4) назвы **маладых істот** з суфіксам ***-яц-*** у адз. л. і ***-ят-*** у мн. л. ва ўскосных склонах: *дзіця, немаўля, кураня, сланяня, медзведзяня;*

5. Назоўнікі нулявога скланення (або нязменныя): *фае, купэ, бра, кенгуру, Сухумі, фрау Элен, Гурло́, Ючко́, Сядых, Эдзіт Піяф*

6. Па-за тыпамі скланення (або множналікавыя): *Пухавічы, сані, Макарычы, абцугі, нажніцы, грудзі*

II. АД'ЕКТЫЎНАЕ СКЛАНЕННЕ

1. Словы, якія перайшлі ў назоўнікі **а) з прыметнікаў**: *сталовая зачынена;* **б) з дзеепрыметнікаў:** *Камандуючы спыніўся;* **в) з парадкавых лічэбнікаў:** *Першы выйшаў, а другі застаўся;* **г) з абагульнена-якасных займеннікаў:** *Нашы прыляцелі; Перш чым на іншага ківаць, узорам сам павінен стаць.*

Репозиторий ВГУ

2. **Прозвішчы** на ***-ы (-і), -ая (-яя),*** якія паходзяць ад **якасных і адносных** прыметнікаў: *Каліноўскі (-ая), Добры (-ая), Гарны (-ая), Брудны (-ая), Белы (-ая)*

III. ЗМЕШАНАЕ СКЛАНЕННЕ (СУБСТАНТЫЎНА - АД'ЕКТЫЎНАЕ)

(**Не блытаць з рознаскланяльнымі!** Назоўнікі змешанага скланення ў адных склонах маюць канчаткі назоўнікаў, а ў другіх — прыметнікаў). **Прозвішчы**, якія паходзяць ад **прыналежных** прыметнікаў з суфіксамі ***-оў, -аў, -еў, -ёў, -ін, -ын (-ов-а, -ав-а, -ев-а, -ёв-а, -ін-а, -ын-а):*** *Іваноў, Сідараў, Гусеў, Сяднёў, Шамякін, Зорын, Паўлава, Злобіна* і г. д.

СКЛОНАВЫЯ КАНЧАТКІ НАЗОЎНІКАЎ

1 1-га склан.: ж. р. на -а, -я і аг. р. ж. полу на -а, -я м. р. з націскнымі а□, -я□ і аг. р. м. полу з націскнымі а□

СКЛОН	А С Н О В А			
	ЦВ.	ЗАЦВ.	Г, Х; К	МЯК. (і j)
Н.	*а*			*я*
Р.	*ы*		*і*	
Д.	*е*	*ы*	*е; э□, ы*	*і*
В.	*у*			*ю*
Т.	*о□й (о□ю), ай (аю)*			*ёй (ёю), яй (яю)*
М.	*е*	*ы*	*е; э□, ы*	*і*
хата, вярба, сірата□, плакса Іна; Крапіва□,		пара, душа, ляўша□ Іра і Іван,	нага, увага, слуга□, скруха; рука, цёзка Іра	зямля, сям'я, зграя, соня Каця, суддзя,□ старшыня□, Ілья□
старшына□, Кузьма□		ханжа□		

2 Рознаскланяльныя: м. р. з ненацiскнымі -а, -я і аг. р. м. полу з ненацiскнымі -а, -я

СКЛОН	А С Н О В А			
	ЦВ.	ЗАЦВ.	Г, Х, К	МЯК. (і j)
Н.	*а*			*я*
Р.	*ы*		*і*	

Репозиторий БГУ

Д.	***у***			***ю***
В.	*у*			*ю*
Т.	***ам***			***ем***
М.	***у***			***ю***
тата, малайчына Грыша, стараста Мікіта, Фр. Скарына	творца Міша; прамоўца — задзіра Юра	бацька; туляга Мурашка; самавучка Алёшка; калека дзядзька Янка	соня Пеця; ціхоня Ваня; дзядуля Міця; Шабуня Косця	

Каментарыі да табліцы № ←

Склонавыя канчаткі назоўнікаў **1-га скланення** залежаць ад характару асновы і ад націску. Звычайна не выклікае цяжкасцей напісанне склонавых канчаткаў назоўнікаў з цвёрдай, мяккай і зацвярдзелай асновамі. Назоўнікі ж **з асновай на *г, х; к*** **ў Д. і М. склонах** маюць канчаткі ***-е*** ; ***-э□*** , ***-ы*** .

Канчатак ***-е*** маюць назоўнікі з асновай на ***г*** ці ***х***, якія чаргуюцца з ***з'***, ***с'*** : **Д. і М. скл.** *на назе, па страсе□, у кнізе, на ўвазе, у скрусе*. У табліцы гэты канчатак ***-е*** і адпаведныя яму назоўнікі з канчаткам ***-е***, а таксама зычныя ***г***, ***х*** у назве асновы аддзелены **кропкай з коскай.**

Націскны канчатак ***-э□*** і ненацiскны ***-ы*** маюць назоўнікі з асновай на ***к***, якое чаргуецца з ***ц*** : **Д. і М. скл.** *на руцэ□, у муцэ□, па рацэ□, к шчацэ□, пры дачцэ□ ; па цё□тцы, у гу□тарцы, на палі□цы, у лы□жцы, пры цё□зцы (Каці), самаву□чцы (Насці), задава□цы (Галі).*

У Т. склоне ў назоўнікаў 1-га склан. дапускаюцца варыянты: ***-о□й***, ***-ё□й*** — пад націскам, ***-ай***, ***-яй*** — не пад націскам і паралельна ім ***-о□ю*** , ***-ё□ю*** — пад націскам, ***-аю*** , ***-яю*** — не пад націскам. Напрыклад:

А с н о в а			
цвёрдая	**зацвярдзелая**	**г, х ; к**	**мяккая (і j)**
-óй (***-óю***), ***-ай*** (***-аю***)			***-ё□й*** (***-ё□ю***), ***-яй*** (***-яю***)

Репозиторий БГУ

вярбо□й (*-о□ю*), *ха□тай* (*-аю*), *старшыно□й* (*-о□ю*), *тамадо□й* (*-о□ю*), *К. Крапіво□й* (*-о□ю*), *сарвігалаво□й* (*-о□ю*), *Фамо□й* (*-о□ю*), *запява□лай* (*-аю*) *Га□ннай* (*-аю*), *сіраці□най* (*-аю*) *А□лай* (*-аю*), *сірато□й* (*-о□ю*), *Кузьмо□й* (*-о□ю*)	*паро□й* (*-о□ю*), *душо□й* (*-о□ю*), *Да□шай* (*-аю*), *ці□шай* (*-аю*), *ляўшо□й* (*-о□ю*), *ханжо□й* (*-о□ю*), *задзі□рай* (*-аю*) *Ве□рай* (*-аю*), *скна□рай* (*-аю*) *Ва□рай* (*-аю*), *прамо□ўцай* (*-аю*) *І□рай* (*-аю*)	*наго□й* (*-о□ю*), *Луко□й* (*-о□ю*), *ува□гай* (*-аю*), *скру□хай* (*-аю*), *страхо□й* (*-о□ю*), *но□шкай* (*-аю*), *цё□зкай* (*-аю*) *Во□льгай* (*-аю*), *самаву□чкай* (*-аю*) *Ві□кай* (*-аю*), *кале□гай* (*-аю*) *Ло□йкай* (*-аю*) *І□нгай* (*-аю*),	*сям'ё□й* (*-ё□ю*), *зграяй* (*-яю*), *раўнё□й* (*-ё□ю*), *Ільё□й* (*-ё□ю*), *размазнё□й* (*-ё□ю*), *старшынё□й* (*-ё□ю*), *со□няй* (*-яю*) *Ю□ляй* (*-яю*), *суддзё□й* (*-ё□ю*), *ціхо□няй* (*яю*) *Ка□цяй* (*-яю*), *пустаме□ляй* (*-яю*) *Але□сяй* (*яю*)

Каментарыі да табліцы № ↑

У рознаскланяльных назоўнікаў м. р. на ненаціскныя ***-а*** **,*-я*** і **аг. р. муж. полу** на ненаціскныя ***-а, -я*** **не выклікае цяжкасцей** напісанне канчаткаў **у Н., Р.** і **В. склонах.** У гэтых склонах няма адрозненняў у параўнанні з канчаткамі адпаведных назоўнікаў у рускай мове.

У такіх рознаскланяльных назоўнікаў **цяжкасці выклікае напісанне канчаткаў у Д., Т.** і **М. склонах.** У гэтых склонах якраз і праяўляецца спецыфіка граматычных нормаў беларускай мовы ў параўнанні з рускай.

☝ **[У рускай мове ўсе** назоўнікі **на** ***-а, -я*** (і ж. р., і м. р., і аг. р. муж. полу) адносяцца да **1-га скланення**. **У беларускай мове толькі з націскнымі канчаткамі назоўнікі м. р. на** *-а□, -я□* і **аг. р. муж. полу на** *-а□, -я□* **адносяцца да 1-га скланення** (табл. № 1)**].**

☝ Назоўнікі **м. р. і аг. р. муж. полу з ненаціскнымі *-а, -я* ў Д., Т. і М. скл. маюць канчаткі 2-га склан.: у Д. і М. скл. — *-у (-ю)*, у Т скл. — *-ам (-ем)*** (у табліцы яны выдзелены):

Репозиторий ВГУ

СКЛОН	А С Н О В А			
	ЦВ.	**ЗАЦВ.**	**Г, Х, К**	**МЯК. (і j)**
Д. і М.	*мужчын**у**, старас**ту**, ваяво**ду**, малайчын**у** Даніл**у**, назол**у** Мікіт**у**, запявал**у** Мікол**у**, Я. Купал**у**, Фр. Скарын**у***	*творц**у**, прамоўц**у**, п'яніц**у** Сярожж**у**, забойц**у** Ягор**у**, абжор**у** Грышш**у**, пранырy Юр**у**, прыдзір**у** Паўл**у**, задзір**у** Валер**у**, скнар**у** Міш**у**,*	*бацьк**у**, прайдох**у** дзядзьк**у**, ваяк**у** Янк**у**, беларучк**у**, Саўк**у**, калег**у** Сёмк**у**, чысцёх**у** Сярожк**у**, калек**у** Грышк**у**, забіяк**у** Пецьк**у**, тулягу Міш**ку***	*дзядул**ю**, дзядз**ю**, сон**ю** Віц**ю**, ціхон**ю** Ван**ю**, пустамел**ю** Пец**ю**, Цярэн**ю** Косц**ю**, Варвашэн**ю** Валодз**ю**, Шабун**ю** Вас**ю***
Т.	*мужчын**ам**, старас**там**, ваяво**дам**, Даніл**ам**, назол**ам** Мікіт**ам**, запявал**ам** Мікол**ам***	*творц**ам**, прамоўц**ам**, абжор**ам** Грышш**ам**, пранырам Рыгорам, задзір**ам** Валер**ам**, скнар**ам** Міш**ам***	*бацьк**ам**, прайдохам дзядзьк**ам**, ваяк**ам** Янк**ам**, сведк**ам** Саўк**ам**, калег**ам** Сёмк**ам**, чысцёх**ам** Сярожк**ам***	*дзядул**ем**, дзядз**ем**, сон**ем** Віц**ем**, ціхон**ем** Ван**ем**, пустамел**ем** Пец**ем**, Цярэн**ем** Косц**ем**, Шабун**ем** Вас**ем***

Заўвага. У акадэмічных выданнях слоўнікаў (акрамя ТСБМ-5 т.) і ў "Беларускай граматыцы" ў рознаскланяльных назоўнікаў м. р. на ненаціскныя -*а*, -*я* і аг. р. м. полу на ненаціскныя -*а*, -*я* **ў М. скл. пры цвёрдай аснове** рэкамендуецца пісаць канчатак **-*е*,** пры астатніх асновах — **-*у*, -*ю*** і ў Д. скл. — **-*у*, -*ю*** (але: *па тату*).[1]

Аўтары ж вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў, ТСБМ, даследчыкі культуры мовы рэкамендуюць пісаць у М. скл **і пры цвёрдай аснове таксама канчатак -*у*** ў назоўнікаў тыпу *та□та, ста□раста, мужчы□на, пла□кса Міко□ла, Скары□на* і пад.[2] **Падставай для ўжывання уніфі-**

---

[1] Слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. М. В. Бірылы.— Мн., 1987, с. 7 і інш.
Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы.— Мн., 1986, с. 171, 174, 183 і інш.
Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы.— Мн., 1994, с. 287 і інш.
Беларуская граматыка: у 2-х ч.— Мн., 1985. Ч.1, с. 84 – 85.
Лобан М.П., Суднік М.Р. Арфаграфічны слоўнік: Для сярэдняй школы.— 6-е выд.— Мн., 1990, с. 26 – 27.

[2] Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. Ф.М. Янкоўскага.— 2-е выд.— Мн., 1980, с. 64 – 65.
Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія.— Мн., 1987, с. 70.
Наркевіч А.І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы.— Мн., 1976, с. 176 – 180.
Сцяцко П. У. Форма дыктуецца зместам // Полымя, № 6, 1991, с. 242 – 244.

Репозиторий ВГУ

каванага канчатка -у ў М. скл. асабовых назоўнікаў м.р. і аг. р. м. полу з ненаціскным -*а*, -*я*, а таксама асабовых назоўнікаў м. р. з нулявым канчаткам **з'яўляецца шырокая распаўсюджанасць** такіх формаў у жывой народнай мове. Гэты пункт гледжання неаднойчы паслядоўна адстойваў **доктар філалагічных навук прафесар П. У. Сцяцко:** "Калі слова з канчаткам -*а*, -*я* адносіцца да м. роду, то яно пры абазначэнні асобы ў Д., Т. і М. склонах мае "мужчынскія" канчаткі, як і словы мужчынскага скланення *(брат, сын)*. Параўнаем: ***Д.*** *сыну, брату, тату, бацьку, Францішку, Скарыну;* ***Т.*** *сынам, братам, татам, бацькам, Францішкам, Скарынам;* ***М.*** *(пры) сыну, брату, тату, бацьку, Францішку, Скарыну*. Такія ўнармаваныя формы прозвішча *Скарына* бачым у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (т. 1, с. 128)" [3].

Калі не быць абыякавымі да лёсу беларускай мовы, то бачыцца натуральнай і з'яўляецца для нас прымальнай пазіцыя аўтара прыведзеных і наступных радкоў, ягоны боль і шчыры клопат П.У. Сцяцко пра чысціню, пра будучыню роднай мовы: "Такая заканамернасць паслядоўна рэалізуецца ў жывой народнай мове, яе трэба трымацца і літаратурнай мове, калі яна жыве яе сокамі, а не скіроўваць свой позірк на іншыя, для некага больш "прэстыжныя мовы" [4]

3 2-га склан. м. р. з нулявым ◻ АСАБОВЫЯ

СКЛОН	А С Н О В А			
	ЦВ.	ЗАЦВ.	Г, Х, К	МЯК. (і j)
М.	***у*** (Наркевіч А.І., Сцяцко П.У. і інш. дактары навук) ***е*** (СБМ)	***у***		***ю***

Сцяцко П. У. Сапега, Сапегу, Сапегам**…:** Як скланяюцца прозвішчы / Роднае слова, № 6, 1995, с. 87 – 92.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т.— Мн., 1977 – 1984. Т. 3, с. 380, Т. 4, с. 629, Т. 5, с. 309 і інш.

[3] Сцяцко П. У. Форма дыктуецца зместам, с. 244.

[4] Там жа, с. 243.

Репозиторий ВГУ

на, пры, у, па	пры дзеду, па прадзеду, суседу, брату(*е*), сыну(*е*), у народзе, на аграноме	пры мужу, Лукашу, па доктару, урачу, свёкру, па байцу	па жаніху, Алегу, манаху, пастуху; настаўніку, арнітолагу	па кавалю, па цесцю, па герою, пры вадзіцелю, Мікалаю, вучню, пры госцю

4 2-га склан. м.р. з нулявым □ НЕАСАБОВЫЯ

СКЛОН	А С Н О В А			
	ЦВ.	ЗАЦВ.	Г, Х; К	МЯК. (і j)
М.	***е***	***ы***	***е; у***	***і***
на, у, пры, па	на слане, у носе, у сне, на лёдзе, у аўсе, на казле, на асле, у гневе, у хляве, на сплаве, у Брэсце, пры павеве	у міры, у метры, на маршы, у канцы, у мячы, на маржы, па стрыжы, у літры, на ветры, у віхры, па крумкачы	на стозе, лузе, у кажусе (-ху), у імху (моху), на сцягу, бульдогу, архіпелагу; у змроку, у воблiку, па ваўку	у гаі, у ча□і, на аленi, на рулі, па пні, на кані, у тыдні, у агні, у рублі, у клеі, у баі, на краі, на дні, у ручаі, у адчаі

Каментарыі да табліц № → і № ↓

Шматлікія памылкі ў студэнтаў выяўляюцца пры ўжыванні ў М. склоне назоўнікаў м. р. з нулявым канчаткам. Гэта наступныя асноўныя **памылкі і іх прычыны:**

← Не размяжоўваюцца **асабовыя і неасабовыя назоўнікі** і таму змешваюцца канчаткі асабовых і неасабовых назоўнікаў **з зацвярдзелай і мяккай асновамі**. Трэба памятаць, што ў М. склоне **асабовыя** назоўнікі м. р. 2-га склан. з зацвярдзелай і мяккай асновамі маюць адпаведна канчаткі **-у , -ю** , а **неасабовыя — -ы , -і**. Гл. у табліцы **№ 3:** *пры мужу, Лукашу, доктару…; пры кавалю цесцю, герою…* і адпаведна ў табліцы **№ 4:** *у міры, метры, маршы…; у гаі□, ча□і, аленi* і г. д.

Репозиторий ПГУ

↑ **У асабовых** назоўнікаў м. р. 2-га склан. **з асновай на заднеязычны** не бывае памякчэння і чаргавання ***г, х, к*** з ***з', с', ц***, таму ўсе асабовыя назоўнікі з асновай на заднеязычны ў М. скл. маюць канчатак ***-у*** **:** *пры жаніх**у**, Алег**у**, манах**у**, пастух**у**, настаўнік**у**…* (гл. табл. **№ 3**).

Але некаторыя **неасабовыя** ўласна беларускія назоўнікі **з асновай на *г, х*** у М. скл. маюць канчатак ***-е*** і адпаведна памякчэнне перад ім апошняга зычнага асновы, **чаргаванне** яго з ***з', с'*** (гл. табл. **№ 4**): *на стоз**е**, луз**е**, берез**е**, у кажус**е**, гарос**е**, на плуз**е**, у снез**е**, на паверс**е**, у парез**е*** і г. д. У неасабовых назоўнікаў **з асновай на *к*** такога **чаргавання не адбываецца.**

Пад уплывам рускай мовы пры нетрывалым засваенні нормаў беларускай мовы і адсутнасці лінгвістычнага чуцця носьбіты рускай мовы не адчуваюць, у якіх беларускіх словах адбываецца памякчэнне заднеязычных, а ў якіх яго няма. Напрыклад, у словах *(у) бег**у**, брэх**у**, выбух**у**, грах**у**, стра□х**у**, жах**у**, арэх**у**, абух**у**, мох**у**, мураг**у**, мях**у**, пірагу* і іншых няма чаргавання.

Пазбегнуць змешвання канчаткаў ***-е*** і ***-у*** ў неасабовых назоўнікаў з асновай на ***г, х*** можна праз развіццё моўнага чуцця, якое прыходзіць пры ўмове пастаяннага карыстання беларускай мовай у штодзённым жыцці.

→ Асаблівую цяжкасць выклікае ў студэнтаў напісанне канчатка ў М. склоне **ў асабовых назоўнікаў з цвёрдай асновай** (гл. табл. **№ 3**). Цяжкасць гэтая тлумачыцца разнабоем у лінгвістычнай навуковай, вучэбнай і даведачнай літаратуры па названай праблеме. ✍ **Аўтары слоўнікаў, акадэмічных выданняў** прызнаю□ць за асабовымі назоўнікамі з цвёрдай асновай толькі канчатак ***-е*** : *(па) сын**е**, аграном**е**, браце, партызан**е**, Якуб**е**, Чэхав**е**.*[1]

✍ **Іншыя ж вучоныя** прызнаю□ць за такімі назоўнікамі толькі канчатак ***-у***, разглядаючы канчатак ***-е*** як адхіленне ад літаратурнай нормы.[2]

---

[1] Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.— Мн., 1959, с. 113.
Слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. М. В. Бірылы, с. 7- 8 і інш.
Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Слоўнік цяжкасцей…, с. 8 – 9 і інш.
Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Кароткі слоўнік беларускай мовы, с. 344 - 345.
Лобан М.П., Суднік М.Р. Арфаграфічны слоўнік: Для сярэдняй школы, с. 29 – 31.
Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / Пад рэд. А. І. Падлужнага.— Мн., 1987, с. 106.
Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т.

[2] Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. Ф.М. Янкоўскага.— 2-е выд., с. 60.

Репозиторий ВГУ

✍ **Трэція вучоныя,** аддаючы перавагу аднаму з двух канчаткаў (канчатку ***-е*** — аўтары БГр. – 85; канчатку ***-у*** — П.П. Шуба, А.І. Наркевіч, М. А. Жыдовіч, Я. М. Камароўскі), прызнаю□ць адзіным магчымым у асобных групах слоў або паралельным варыянтным і другі канчатак.[3] Напрыклад, А. І. Наркевіч у асабовых назоўнікаў м. р. з цвёрдай асновай прапануе пісаць канчатак ***-у*** ў М. скл. адз. л., але робіць заўвагу і пра ўжыванне ў такіх назоўнікаў канчатка ***-е*** "па аналогіі з іх ужываннем у рускай мове (параўн. рус. *о сыне, брате, поэте, лейтенанте* і інш.)"[4] Пры гэтым А. І. Наркевіч не вызначае статус такіх формаў: ці гэта паралельны побач з ***-у*** варыянтны канчатак, ці гэта адхіленне ад літаратурнай нормы. У гэтым выпадку таксама варта прыслухацца да думкі тых вучоных, якія, улічваючы шырокае распаўсюджанне ў беларускіх гаворках і ў пісьмовай мове формаў на ***-у***, прапанавалі **уніфікаваць для асабовых назоўнікаў м. р. канчаткі ў М. скл.,** г. зн. прызнаць "у якасці літаратурнай нормы формы на ***-у*** (***-ю***) для асабовых назоўнікаў незалежна ад якасці апошняга зычнага асновы."[5] Прыхольнікамі гэтага пункта погляду з'яўляюцца і доктар філалалагічных навук прафесар П.У. Сцяцко, і аўтары "Сучаснай беларускай літаратурнай мовы" пад рэд. Ф. М. Янкоўскага, і аўтары "Беларускай мовы" пад рэд. Г. М. Малажай, і іншыя мовазнаўцы.

СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ

ФОРМА	ВЫШЭЙШАЯ СТУПЕНЬ	НАЙВЫШЭЙШАЯ СТУПЕНЬ

Репозиторий ВГУ

Беларуская мова / Пад рэд. Г. М. Малажай.— Мн., 1986, с. 80.
Сцяцко П. У. Форма дыктуецца зместам, с. 242 – 244.
Сцяцко П. У. Сапега, Сапегу, Сапегам…: Як скланяюцца прозвішчы, с. 91 – 92.
[3] Беларуская граматыка. У 2-х ч. Ч. 1, с. 68.
Шуба П. П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія, с. 68.
Камароўскі Я. М. Сучасная беларуская арфаграфія.— Мн., 1985, с. 71.
Жыдовіч М.А. Назоўнік у беларускай мове: Адзіночны лік.— Мн., 1969. Ч. 1, с. 104.
Дыялекталагічны атлас беларускай мовы.— Мн., 1963. Карта № 79.
Граматыка беларускай мовы: У 2-х т.— Мн., 1962. Т.1, с. 53 – 54.
Наркевіч А. І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы, с. 110 – 111.
[4] Там жа, с. 110.
[5] Беларуская граматыка, с. 68.

ПРОСТАЯ ФОРМА	**-ейш- (-эйш-):** кіслы → кісл***ейш***ы, высокі → выш***эйш***ы; суплетывацыяй асноў: добры → лепшы, дрэнны → горшы, малы → меншы, вялікі → большы; ***-ей, -эй, -ай*** — не ўжываць, бо атрымаецца аманімія з прыслоўямі ў вышэйшай ступені параўнання. (Можна ўжываць толькі ў фальклёры і зрэдку ў мастацкім стылі)	**най-:** кіслейшы → ***най*** кіслейшы; зрэдку: вялікі→ ***най*** вялік***ш***ы, новы → ***най*** ноў***ш***ы, багаты → ***най*** багат***ш***ы, дарагі → ***най*** дарож***ш***ы
СКЛАДАНАЯ ФОРМА	**больш, менш:** кіслы → ***менш*** кіслы, высокі → ***больш*** высокі **НЕЛЬГА:** ~~***больш*** кісл***ейш***ы~~	**самы, найбольш, наймен ш:** кіслы → { ***самы*** кіслы, ***найбольш*** кіслы, ***наймен ш*** кіслы **НЕЛЬГА :** ~~***самы*** кісл***ейш***ы, ***найбольш*** кісл***ейш***ы~~

НЕ ЎТВАРАЮЦЦА ПРОСТЫЯ ФОРМЫ

ад **якасных** прыметнікаў з суфіксамі ***-авіт-, -ав-, -яв-, -ляв-, -лів-, -іст-, -юч-, -аўн-, -ат-, -н-, -к-, -л-, -ічн-, -ніч-, -еньк-, -эзн-*** : цяг*авіт*ы, перад*ав*ы, бял*яв*ы, вярт*ляв*ы, крык*лів*ы, агн*іст*ы, бал*юч*ы, сак*аўн*ы, шурп*ат*ы, марог*зн*ы, коў*к*і, чу*л*ы, гера*ічн*ы, маляў*ніч*ы, мал*еньк*і, велічэ*зн*ы і інш.

НЕ ЎТВАРАЮЦЦА ПРОСТЫЯ І СКЛАДАНЫЯ ФОРМЫ

ад **якасных** прыметнікаў, якія абазначаюць

1) **колькасна нязменную якасць:** сляпы, глухі, халасты, замужняя, жанаты, босы, голы, жывы, мёртвы, вусаты, рагаты, крывы і інш.;
2) **масці жывёл:** руды, рыжы, буры, гняды, буланы, вараны, рабы, ка́ры, русы, пярэсты;
3) назвы некаторых **колераў (вытворныя** прыметнікі**):** карыч***нев***ы, блакіт***н***ы, бронз***ав***ы, васільк***ов***ы, руж***ов***ы, вішн***ёв***ы, фіялетавы і інш;
4) **складаныя прыметнікі:** бел***а***бокі, лап***а***вухі, чарн***а***бровы, цёмн***а***-сіні.

ПАМЫЛКІ ПРЫ ЎТВАРЭННІ І ЎЖЫВАННІ СТУПЕНЕЙ ПАРАЎНАННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ

Репозиторий ВГУ

① Пры ўтварэнні **СКЛАДАНЫХ ФОРМАЎ** трэба далучаць словы ***больш, менш, самы, найбольш, найменш*** да зыходных формаў, а **не да вышэйшай і не да найвышэйшай ступеней параўнання** (гл. табліцу).

② **НЯЗМЕННЫЯ ФОРМЫ** вышэйшай ступені параўнання з суфіксамі ***-ей, -эй, -ай*** тыпу *леп**ей**, выш**эй**, гор**ай*** лічацца адхіленнем ад літаратурнай нормы, бо яны аманімічныя з адпаведнымі формамі прыслоўяў і безасабова-прэдыкатыўных слоў у вышэйшай ступені параўнання.

③ **ВЫШЭЙШАЯ СТУПЕНЬ ПАРАЎНАННЯ** звычайна ўжываецца з **аб'ектам параўнання** ў форме **1) В. скл. з прыназоўнікам *за*:** *Ён быў старэйшы **за** сябра на два гады.* **2) Н. скл. з** параўнальным **злучнікам *чым*** або ***як*:** *Ён быў старэйшы, **чым** сябар* (або: ***як** сябар), на два гады. Сёлетні ўраджай лепшы, **як** леташні* (або: ***чым** леташні*).

Формы **Р. скл. без прыназоўніка** тыпу "*смялей яго*", "*святлей расы*" — гэта рускія канструкцыі, гэта **адхіленне** ад нормаў беларускай мовы. Формы **Р. скл.** з прыназоўнікам ***ад*** у беларускай мове дапушчальныя ў мастацкім стылі (але не ў навуковым і не ў дзелавым): *Мацн**ейш**ым **ад** голасу быў посвіст бурану.*

④ **НАЙВЫШЭЙШАЯ СТУПЕНЬ ПАРАЎНАННЯ** звычайна ўжываецца з аб'ектам параўнання ў форме **1) Р. скл.** з прыназоўнікам ***з*** або ***сярод*:** *Ляжыць на зямлі **най**вышэйшая **з** сосен* (або ***сярод** сосен*); **2) В. скл.** з прыназоўнікам ***за*** і займеннікам ***усё*** або ***ўсіх* :** ***най**даражэйшы **за ўсіх*** (або: ***най**даражэйшы **за ўсё***).

НЕ БЛЫТАЦЬ: У рускай мове прыметнікі з суфіксам ***-ейш-*** тыпу *добр**ейш**ий в мире человек, полезн**ейш**ие вещи, древн**ейш**ие орудия труда* — гэта **найвышэйшая ступень ("превосходная степень")**, а ў беларускай мове — вышэйшая. Таму **ў беларускай мове** такім канструкцыям адпавядаюць простыя або складаныя формы найвышэйшай ступені параўнання: ***най**лепшы (**най**дабрэйшы) ў свеце*; ***самыя** карысныя рэчы, **самыя** старажытныя прылады працы.*

Каментарыі

да табліцы "Ступені параўнання прыметнікаў"

Репозиторий ВГУ

1. Аўтары ”Сучаснай беларускай літаратурнай мовы” пад рэд. Ф. М. Янкоўскага (с. 93) **лічаць адхіленнем ад літаратурнай мовы** простыя нязменныя формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў з суфіксамі ***-ей, -эй*** (зрэдку ***-ай***), таму што яны аманімічныя з прыслоўямі і безасабова-прэдыкатыўнымі словамі ў форме вышэйшай ступені параўнання. ☝ **Але** наўрад ці варта катэгарычна адносіць такія формы прыметнікаў да памылковых і ставіцца да іх непрымірыма. Бо, **з аднаго боку, жывая мова пазбягае аманіміі формаў, а з другога боку, імкнецца да кароткасці ў перадачы думкі.** Таму з дзвюх магчымых формаў выказвання думкі ў народзе перавага аддаецца карацейшай. Нязменныя формы прыметнікаў на ***-ей, -эй*** карацейшыя за формы з суфіксамі ***-ейш-, -эйш-,*** і таму апошнія бытуюць у жывой мове, ужываюцца ў паэтычных, у фальклёрных творах, у мастацкай літаратуры, куды трапляюць з народнай мовы, з жывой гаворкі. Напрыклад:

*Няма здрады мацн**ей**, чым здрада бліжняга. (Прыказка) Слова даражэ**й** золата. (Прыказка) Хто смял**ей** за цябе? Ноч даўжэ**й** за дзень. Не было нікога дуж**ай** за яго.*

*І чым далей, тым гусц**ей** здаваліся гэтыя развіслыя тоўстыя бярозы. (Я. Колас) Даражэ**й** за ўсё свабода. (Я. Колас) Сама бял**ей** ад палатна. (Я. Колас) Мусіць, ён* [*Мядзведжы хрыбет*] *быў куды выш**эй** за пяройдзены. (В. Быкаў) Зямля, ты стала для мяне радн**ей** і даражэ**й**. (П. Панчанка) І не было нічога ярч**эй** за сонца на родным небе, і не было нічога смачн**ей** матчынага хлеба. (П. Панчанка)* […] *Мацн**ей** не знаем пачуцця… (П. Броўка) Леп**ей** за ўсё мне на свеце мясціна тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос. (К. Кірэенка)*

2. У лінгвістычнай літаратуры па марфалогіі сярод суфіксаў, якія ўтвараюць простую форму вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў, называецца і суфікс ***-ш-*** , які не толькі ўтварае гутарковыя, дыялектныя формы тыпу *багат**ш**ы, дуж**ш**ы*, але і прыметнікі ***большы, меншы, лепшы, горшы***. Гэтыя 4 формы ўтварыліся **не пры дапамозе суфікса *-ш-***, а толькі пры дапамозе суплетывацыі асноў. Іншая справа, што **пры марфемным падзеле** гэтых формаў выдзяляецца суфікс ***-ш-***, бо ёсць у мове аднакаранёвыя з імі прыслоўі і безасабова-прэдыкатыўныя словы: *леп**ей**, леп**ш**, гор**ай**, гор**ш**, мен**ей**, мен**ш**, бол**ей**, боль**ш**.*

СІНТАКСІЧНАЯ СУВЯЗЬ ЛІЧЭБНІКАЎ З НАЗОЎНІКАМІ

Рэпозиторий ВГУ

① Уласнаколькасны ліч. ***адзін*** (***адна*** , ***адно*** , ***адны***) **дапасуецца** да наз. у р., л., скл. ва ўсіх склонах. Гэта поўнае дапасаванне. Напр.**:**
Н. адзін □ дом □, адн***а*** сцян***а***, адн***о*** акн***о***, адн***ы*** варот***ы***
Р. адн***аго*** дом***а***, адн***ой*** сцян***ы***, адн***аго*** акн***а***, адн***ых*** варот □
Д. к адн***аму*** дом***у***, адн***ой*** сцян***е***, адн***аму*** акн***у***, к адн***ым*** варот***ам*** і г. д.

② Уласнаколькасны ліч. ***два*** (***дзве***) і зборны ***абодва*** (***абедзве***) **дапасуюцца** да наз. у родзе і склоне ва ўсіх склонах. Гэта **ня**поўнае дапасаванне. Напр.**:** *Н.* дв***а*** (аб***о***дв***а***) стал***ы***, дзв***е*** (аб***е***дзв***е***) ручк***і***
Р. дв***ух*** (аб***о***дв***ух***) стал***оў***, дзв***юх*** (аб***е***дзв***юх***) ручак □
Т. з дв***ума*** (аб***о***дв***ума***) стал***амі***, дзв***юма*** (аб***е***дзв***юма***) ручк***амі*** і пад.

③ Уласнаколькасныя ліч. ***тры***, ***чатыры*** **дапасуюцца** да наз. у склоне ва ўсіх склонах. Гэта таксама **ня**поўнае дапасаванне. Напр.**:**
Н. тр***ы***, чатыр***ы*** дуб***ы***, рэчк***і***
Р. тр***ох***, чатыр***ох*** дуб***оў***, рэчак □
Т. з тр***ыма***, чатыр***ма*** дуб***амі***, рэчк***амі*** і да т. п.

④ Уласнаколькасныя лічэбнікі **ад** ***пяці*** **і вышэй** і ўсе ***зборныя*** (*трое, пяцёра, дзевяцера, адзінаццацера* і пад.) **кіруюць** назоўнікамі (патрабуюць ад іх ф. **Р. скл. мн. ліку**) **у Н.** і **В. скл.,** а ў астатніх склонах **таксама дапасуюцца** да назоўнікаў у склоне. Напрыклад**:**
Н. пяць □ рубл***ёў***, дво***е*** кацянят □ — кіраванне Р. склонам мн. ліку
Р. пяц***і*** рубл***ёў***, два***іх*** кацянят □ — дапасаванне ў склоне
Д. к пяц***і*** рубл***ям***, два***ім*** кацянят***ам*** — дапасаванне ў склоне
В. як Н. (пры неадуш. назоўніках) або як Р. (пры адуш. назоўніках)
Т. з пяцц***ю*** рубл***ямі***, два***імі*** кацянят***амі*** — дапасаванне ў склоне
М. на пяц***і*** рубл***ях***, на два***іх*** кацянят***ах*** — дапасаванне ў склоне

АЛЕ: *тысяча, мільён, мільярд* і іншыя назвы буйных велічынь (*квадрыльён, квінтыльён, секстыльён*) **кіруюць ва ўсіх склонах**, а не толькі ў Н. і В.**:**

Н. тысяч***а*** рубл***ёў***	*В.* тысяч***у*** рубл***ёў***
Р. тысяч***ы*** рубл***ёў***	*Т.* з тысяч***ай*** рубл***ёў***
Д. к тысяч***ы*** рубл***ёў***	*М.* у тысяч***ы*** рубл***ёў***

⑤ ***Дробавыя ліч.*** **кіруюць** назоўнікамі (патрабуюць ад іх формы **Р. скл. адз. л.**) **ва ўсіх склонах !** Напрыклад**:**

Н. дзв***е*** пятыя метр***а***	*В.* дзв***е*** пятыя метр***а***
Р. дзв***юх*** пятых метр***а***	*Т.* дзв***юма*** пятымі метр***а***
Д. дзв***юм*** пятым метр***а***	*М.* у дзв***юх*** пятых метр***а***

Репозиторий ВГУ

☝ **АЛЕ (выключэнне з дробавых):** Ліч. ***паўтара (паўтары)*** **кіруе** ў Н. і В. склонах Р. склонам **адз. л.,** а ў астатніх склонах патрабуе ад назоўніка Р. склону **мн. л.,** сам жа лічэбнік пры гэтым не змяняецца (іншымі словамі, тут усё наадварот: калі пры астатніх дробавых не змяняецца назоўнік, то тут не змяняецца лічэбнік). А іменна:

Н.	паўтара літр***а***,	паўтары міск***і***
Р.	паўтара літр***аў*** (і ***-а***),	паўтары місак □ (і -ск***і***)
Д.	к паўтара літр***ам***,	паўтары міск***ам***
В.	паўтара літр***а***,	паўтары міск***і***
Т.	з паўтара літр***амі***,	паўтары міск***амі***
М.	у паўтара літр***ах***	у паўтары міск***ах***

☝ **УВАГА !** Калі **дробавы** лічэбнік **заканчваецца на** ***тысяча, мільён, мільярд, квадрыльён, квінтыльён, секстыльён,*** то гэтыя назвы буйны□х велічынь пры скланенні прымыкаюць у адзіночным ліку, а назоўнік прымыкае ў мн. ліку:

Н. дзвесце цэлых і дзве пят**ыя** ***мільёна*** *рублёў*
Р. двухсот цэлых і дзвюх пятых ***мільёна*** *рублёў*
Д. к дв***ум***ст***ам*** цэлым і дзвюм пятым ***мільёна*** *рублёў*
В. як Н.
Т. з дв***ума***ст***амі*** цэлымі і дзв***юма*** пятымі ***мільёна*** *рублёў*
М. у дв***ух***ст***ах*** цэлых і дзв***юх*** пятых ***мільёна*** *рублёў*

⑥ ***Састаўныя ўласнаколькасныя ліч.*** **дапасуюцца** да наз. **або кіруюць** імі ў залежнасці ад таго, якім словам заканчваецца састаўны лічэбнік:

1) калі словам **адзін (адна, адно, адны),** то гл. пункт ① (будзе поўнае дапасаванне ў родзе, ліку і ў склоне ва ўсіх склонах): 141 рубель, 141 акно, 141 рака, 141 вароты…
2) калі словам **два (дзве),** то гл. пункт ② (будзе дапасаванне ў родзе і ў склоне ва ўсіх склонах): 32 рублі, 32 кнігі…
3) калі словам **тры** або **чатыры,** то гл. пункт ③ (будзе дапасаванне ў склоне ва ўсіх склонах);
4) калі словам **пяць, шэсць** і г. д., то гл. пункт ④ (будзе кіраванне Р. склонам мн. л. у Н. і В. склонах, а ў астатніх склонах таксама дапасаванне ў склоне).

⑦ ***Парадкавыя ліч.*** **дапасуюцца** да назоўнікаў ва ўсіх склонах у родзе, ліку і склоне, як прыметнікі. Гэта поўнае дапасаванне.

Репозиторий ВГУ

Сінтаксічная сувязь паміж словамі ў межах дробавых лічэбнікаў

такая ж, як і вышэй апісаная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. Таму трэба правільна чытаць лічэбнікі 1,2 % ; 0,004 т ; 0 $^{3}/_{5}$ ц ; $^{3}/_{25}$; 1,7 м ; 4,2 га і падобныя: *адн**а** цэл**ая** і дзв**е** дзесят**ыя** працэнт**а*** (а не *адзін □ цэл**ы**,* не *дв**а** дзесят**ых***); *нуль цэл**ых** і чатыры сот**ыя** тон**ы*** (а не *нуль цэл**ы**,* не *чатыры сот**ых***); *нуль цэл**ых** і тры пят**ыя** цэнтнер**а*** (а не *тры пят**ых***); *тры дваццаць пят**ыя*** (а не *тры дваццаць пят**ых***); *адн**а** цэл**ая** і сем дзесятых метр**а**; чатыры цэл**ыя** і дзве дзесят**ыя** гектар**а*** (а не *чатыры **цэлых*** і не *дзве дзесят**ых*** і г. д.

ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ ЗАЙМЕННІКАЎ

У адпаведнасці з лексічным значэннем і граматычнымі прыметамі займеннікі традыцыйна падзяляюцца на наступныя **9 разрадаў:**

1) асабовыя: а) уласнаасабовыя: *я, мы, ты, вы;*
   б) асабова-ўказальны: *ён (яна, яно, яны);*
2) зваротны: *сябе;*
3) прыналежныя: *мой, твой, свой, наш, ваш;* ☝ ***яго, яе, іх*** (асабова-ўказальныя **ў значэнні прыналежных**);
4) указальныя: *гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі;*
5) азначальныя: *сам, самы, увесь, усякі, кожны, іншы,* ☝ ***любы□, усялякі, інакшы;***
6) пытальныя: *хто ?, што ?, які ?, каторы ?, чый ?, колькі ?*
7) адносныя: *хто, што, які, каторы, чый, колькі;*
8) адмоўныя: *ніхто, нішто, ніякі, нічый, нікольки;*
9) няпэўныя (неазначальныя): *нехта, нешта, нейкі, некаторы(я), нечы (нейчы), некалькі;*
   хтосьці, штосьці, якісьці, чыйсьці;
   хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь, чый-небудзь, колькі-небудзь;
   абы-хто, абы-што, абы-які, абы-чый, абы-колькі;

☝ ***сёй-той, сякі-такі, хто-ніхто, што-нішто*** і іншыя.

Репозиторий ВГУ

ЛІТАРАТУРА

Асноўная

1. Беларускай граматыка: У 2-х ч. / Рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба.— Мн., 1985. Ч. 1.
2. Беларуская мова / Пад рэд. М.С. Яўневіча.— Мн., 1991.
3. Виноградов В.В. Русский язык. Грамматическое учение о слове.— Изд. 2-е.— М., 1972.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад рэд. Ф.М. Янкоўскага.— 2-е выд., дапрац. — Мн., 1980.
5. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія / Пад агульнай рэд. праф. М.С. Яўневіча.— Мн., 1997.
6. Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія.— Мн., 1987.

Дадатковая

1. Аналіз слова, словазлучэння, сказа: Вучэбна-метадычны дапаможнік / М.Ц. Кавалёва, К.М. Панюціч, П.У. Сцяцко і інш.; Пад рэд. Ф.М.Янкоўскага.— Мн., 1977.
2. Арашонкава Г. У., Лемцюгова В. П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы.— Мн., 1986.
3. Беларуская мова: Дапаможнік для абітурыентаў / Э.Д. Блінава, Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва і інш.— 3-е выд.— Мн., 1997.
4. Беларуская мова: Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / Пад рэд. А.І. Падлужнага.— Мн.,1987. (Б-ка настаўніка беларус. мовы і літ.).
5. Беларуская мова: Энцыклапедыя/ Пад рэд. А.Я. Міхневіча.— Мн., 1994.
6. Булахаў М.Г. Прыметнік у беларускай мове.— Мн., 1964.
7. Виды разбора на уроках русского языка: Пособие для учителя / В.В. Бабайцева, В.М. Шаталова, Г.К. Лидман-Орлова и др.— 2-е изд., перераб. — М., 1985.
8. Вярхоў П. В. Лічэбнік у беларускай мове.— Мн., 1961.
9. Граматыка беларускай мовы: У 2-х т. / Пад рэд. К.К. Атраховіча і М.Г. Булахава.— Мн., 1962. Т. 1.
10. Кечык С. Я., Рагаўцоў В.І. Моўны разбор у ВНУ і ў школе: Схемы, узоры, заданні.— Мн., 1988.
11. Лаўрэль Я.М. і інш. Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я.М.Лаўрэль, Т.Р. Новікава, С.А. Язерская.— Мн., 1991. (Б-ка настаўніка беларус. мовы і літ.)
12. Лепешаў І.Я. і інш. Практыкум па беларускай мове: Вучэб. дапам. / І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, К.М. Панюціч.— Мн., 2001.

Репозиторий ВГУ

13. Марозава Я.Н. Марфалагічны аналіз. Частка 2 / Вучэбна-метад. дапам. для студэнтаў.— Віцебск, 1999.
14. Марозава Я.Н. Тэсты па беларускай мове: Вучэбны дапам. для студэнтаў філфакаў.— Віцебск, 2002.
15. Наркевіч А. І. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі і формы.— Мн., 1976.
16. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум.— Мн., 2003.
17. Слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. М. В. Бірылы.— Мн., 1987.
18. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т.— Мн., 1977 – 1984.
19. Чеснокова Л. Д., Печникова В. С. Современный русский язык: Теория. Анализ языковых единиц: В 3 ч.: Ч. II : Морфология.— Ростов-на-Дону, 1997.
20. Чеснокова Л. Д. Русский язык: Трудные случаи морфологического разбора.— М., 1991.
21. Чиркина И. П. Современный русский язык в таблицах и схемах. Ч. 2.— М., 1980.
22. Янкоўскі Ф. М. Сучасная беларуская мова.— Мн., 1984, с. 14 – 30, 53 – 79.

Репозиторий ВГУ

З М Е С Т

Марфалагічны разбор……. 3
Этапы марфалагічнага аналізу…….. 3
Парадак і ўзоры марфалагічнага разбору часцін мовы… 9
Назоўнік.
Парадак разбору назоўніка……. 9
Узоры разбору…….. 9
Каментарыі да ўзораў разбору назоўнікаў……. 10
Прыметнік
Парадак разбору прыметніка…….. 12
Узоры разбору…….. 13
Каментарыі да ўзораў разбору прыметнікаў…….. 14
Лічэбнік
Парадак разбору лічэбніка……. 14
Узоры разбору…….. 15
Каментарыі да ўзораў разбору лічэбнікаў…….. 16
Займеннік
Парадак разбору займенніка…….. 17
Узоры разбору…….. 18
Каментарыі да ўзораў разбору займеннікаў…… 18
Кантрольная работа № 1 па марфалогіі…….. 20
Табліцы і каментарыі да іх…… 23
Алгарытм ”Род абрэвіятур”. Каментарый…… 23
Тыпы скланення назоўнікаў…….. 24
Склонавыя канчаткі назоўнікаў……. 25
Табліца № 1: 1-га скланення……. 25
Табліца № 2: Рознаскланяльныя……... 25
Каментарыі да табліцы № 1……. 26
Каментарыі да табліцы № 2……. 27
Табліца № 3: 2-га скланення асабовыя…….. 29
Табліца № 4: 2-га скланення неасабовыя……... 29
Каментарыі да табліц № 3 і № 4…… 30
Ступені параўнання прыметнікаў…….. 32
Памылкі пры ўтварэнні і ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў…… 33
Каментарыі да табліцы ”Ступені параўнання прыметнікаў”.. 34
Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі…… 35
Лексіка-граматычныя разрады займеннікаў……. 37
Літаратура…….. 38

Репозиторий ВГУ